Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

197 (6776) | 25 жніўня 1940 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ.

М. Кітайчык — Рост комсамольскага актыва.

М. Паўлючэнкаў — Як у вагонным дэпо прагульшчыка абаранялі.

Сход партыйнага актыва г. Гродна.

Раённы партыйны сход.

Вахта імені Міжнароднага юнацкага дня.

Нарада актыва работнікаў лёгкай прамысловасці.

АРТЫКУЛЫ:

А. Шчэрбакоў — Вегетацыйны домік.

С. Ключынскі — Гатовы стаць на абарону радзімы.

З. Ларысаў — Брак — біч вытворчасці.

Ф. Лельчук — Па-большэвіцку арганізаваць збожжапастаўкі.

Няўхільна выконваць закон аб дзяржаўных пастаўках.

М. Пратусевіч — Клапаціцца аб школах для дарослых.

На абноўленай зямлі квітнее новае жыццё (гутарка з Народным камісарам земляробства БССР тав. І. А. Крупеня).

У ДАПАМОГУ ЧЫТАЧУ. **Н. Андрзеў** — «Вярблюжы корпус».

Смерць міжнароднага шпіёна (артыкул «Праўды» ад 24 жніўня 1940 г.).

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН. **С. Куняўскі** — Біфштэкс і загады.

ЗА РУБЯЖОМ:

Паветраныя баі над Англіяй.

Заява Рузвельта па пытанню аб увядзенні абавязковай воінскай павіннасці.

Перагаворы ўрада ЗША з Канадай і Англіяй.

ПЕРАД НОВЫМ ТЭАТРАЛЬНЫМ СЕЗОНАМ

Новы тэатральны сезон у гэтым годзе пачынаецца пасля знамянальнай падзеі ў жыцці беларускага народа. Гэтай падзеяй явілася дэкада беларускага мастацтва ў Маскве. Дэкада была сапраўднай дэманстрацыяй грандыёзных поспехаў беларускага народа, дасягнутых у галіне будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу. Яна з'явілася лікім святам нашай краіны, таржествам дамог ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Беларускі народ на дэкадзе бліскуча паказаў, як пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна ў многанацыянальнай краіне Савецкаў расквітнелі народныя таленты, магутнымі фантанамі білі крыніцы народнай творчасці.

Дэкада з'явілася вялікім стымулам для росту ўсяго мастацтва рэспублікі. Яна ссунула перад усімі творчымі калектывамі адказныя задачы далейшага паляпшэння работы, стварэння новых ідэйна-мастацкіх твораў.

Выкананню гэтых задач зараз садзейнічаюць і тыя ўмовы, у якіх пачынаецца новы тэатральны сезон. Творчыя калектывы, перайшоўшы згодна Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня на васьмігадзінны рабочы дзень і сямідзённы тыдзень, маюць велізарнейшыя магчымасці павелічэння колькасці пастановак, рашучага палепшання іх якасці. Ліквідаваўшы сістэму прыцягнення гледача за кошт дзяржавы, нашы тэатры звязаны сваёй работай, якасцю сваіх спектакляў заваяваць яшчэ большую любоў працоўных, прыцягваць новыя і новыя тысячы гледачоў.

Прынятыя савецкім урадам мерапрыемствы па ўпарадкаванню работы тэатраў вінны паслужыць справе рэзкага скарачэння непатрэбных выдаткаў, эканоміі дзяржаўных сродкаў і палепшання іх творчай і арганізацыйнай дзейнасці.

У надыходзячым сезоне нашы тэатры пакажуць свае новыя работы. Дзяржаўны тэатр імя Леніна оперны тэатр БССР пачне сезон з паказу дэкадных спектакляў. Гэта будзе па сутнасці шырокая справаздача перад працоўнымі рэспублікі. Такія выдатныя творы беларускага мастацтва, як оперы «Кветка шчасця»—Міранкова, «Міхась Падгорны»—Цікоцкага, «У пушчах Палесся»—Багатырова і балет «Салавей»—Крошнера, якія карысталіся вялікім поспехам у працоўных Масквы, несумненна заваюць любоў шырокіх мас. Задача калектыва операнага тэатра заключаецца зараз у тым, каб паказаць гэтыя спектаклі поўнаякасна, як у дэкадзе, і на яшчэ больш высокім узроўні, падрыхтаваць новыя пастаноўкі яшчэ лепшай якасці. Для кожнага тэатра гэтым сезоне асноўнай задачай павінна быць замацаванне поспехаў дэкады, узвышэнне якасці работы на вышэйшую ступень.

Першы Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага сцяга драматычны тэатр таксама пакажа працоўным дэкадныя спектаклі і п'есы вялікіх класікаў сусветнай драматургіі В. Шэкспіра і Лопе дэ-Вега, ад якімі ён зараз працуе. Сур'ёзным недахопам аднак трэба прызнаць, што ў яго зараз няма ў вытворчасці ні адной новай арыгінальнай беларускай п'есы. Тэатр абавязан прыняць усе меры да ліквідацыі гэтага істотнага недахопу. Паказаўшы рад выдатных п'ес беларускіх драматургаў (Крапівы і інш.), ён абавязан і надалей даваць узоры работы над арыгінальнымі творамі.

Новымі творамі адзначаць пачатак тэатральнага сезона і Другі драматычны тэатр, яўрэйскі, рускі, польскі, абласныя і калгасна-соўгасныя тэатры БССР. Вялікай палітычнай павагай у творчым жыцці тэатраў будзе пастаноўка п'ес, у якіх паказваецца вобраз вялікага Леніна. Так, Другі дзяржаўны драматычны тэатр (Віцебск) у хуткім часе ажыццяўляе пастаноўку п'есы Пагодзіна «Крэмлёўскія куранты». Ролю Леніна ў спектаклі выконвае народны артыст БССР ордэнаносец П. С. Малчанаў. Яўрэйскі дзяржаўны драматычны тэатр (Мінск) у новым сезоне таксама будзе працаваць над стварэннем вобраза Леніна па п'есе «Уладзімір Ульянаў».

Над новымі спектаклямі будуць працаваць Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР, абласныя тэатры, тэатры юнага гледача, калгасна-соўгасныя тэатры. Тэатр музыкальнай камедыі БССР, пасля ажыццяўлення пастаноўкі першай беларускай музыкамедыі «Зарэчны барок», будзе прадаўжаць работу над стварэннем новага арыгінальнага рэпертуару. Калектыў музкамедыі пачне сезон у Беластоку, дзе яму перадаецца памяшканне гарадскога тэатра. У новым сезоне ўступае ў строй мастацкіх прадпрыемстваў Дзержынскі калгасна-соўгасны тэатр, і будзе арганізаван рускі тэатр у г. Брэсце.

Сетка савецкіх тэатраў нашай рэспублікі няўхільна расце. Дзякуючы клопатам партыі і ўрада, працоўныя заходніх абласцей БССР атрымалі велізарнейшыя магчымасці для свайго культурнага ўзбагачэння, далучыліся да вялікай савецкай культуры, сталі гаспадарамі мастацкіх каштоўнасцей.

Як непазнавальна змянілася жыццё працоўных заходніх абласцей БССР за год пасля іх вызвалення! Гэта надзвычай ярка відаць і ў галіне мастацтва. Замест антымастацкіх балаганных труп, тут выраслі зараз дзесяткі творчых калектываў, сур'ёзна працуючых над класічнымі творамі, пясучых працоўным сцэнічную, музыкальную, сапраўды мастацкую культуру. Вялікім поспехам карыстаецца ў Маскве Дзяржаўны джаз БССР, які зараз там выступае. Цёпла сустрэлі масквічы хор сяла Вялікае Падлессе, Баранавіцкай абласці, які прымаў удзел у дэкадзе. Поспехам карыстаецца польскі тэатр у Гродне, яўрэйскі — у Беластоку, абласныя драматычныя беларускія тэатры—у Пінску, Баранавічах.

Небывалы рост тэатраў знамянуе сабою сапраўды вялікае развіццё мастацтва ў заходніх абласцях. У новым сезоне тут будуць функцыяніраваць дзевяць стацыянарных тэатраў, якія абслужаць многія тысячы працоўных. Трэба толькі паскрэсліць, што ўсе гэтыя калектывы вельмі адчуваюць патрэбу ў дапамозе, якую ім павінны аказаць творчыя калектывы ўсходніх абласцей. На жаль, абавязацельствы, якія былі ўзяты апошнімі поўгода таму назад, астаюцца нерэалізаванымі, канкрэтная дапамога маладым калектывам яшчэ па-сапраўднаму не аказваецца. Тут значная віна падае і на Ўпраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, якое забывае аб неабходнасці аказаць дзейсную дапамогу новаствораным калектывам.

Няма сумнення, што новы тэатральны сезон прыняце яшчэ большыя перамогі беларускаму савецкаму мастацтву. Задача творчых калектываў зараз заключаецца ў тым, каб па-большэвіцку ўзяцца за работу, знішчыць арганізацыйныя непаладкі, павесці рашучую барацьбу за ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Не можа быць месца сярод творчых работнікаў прагульшчыкам і дэзарганізатарам вытворчасці. Трэба пяўхільна паляпшаць якасць пастановак, ствараць праўдзівыя, рэалістычныя спектаклі!

У новым сезоне творчае жыццё павінна забіць з яшчэ большай сілай. Творчыя работнікі, паспяхова прадэманстраваўшыя свае дасягненні ў Маскве на дэкадзе і атрымаўшыя высокую ацэнку партыі і ўрада, павінны і надалей выдатнай якасцю сваёй работы множыць поспехі беларускага савецкага мастацтва.

НЯЎХІЛЬНА ВЫКОНВАЦЬ ЗАКОН АБ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАСТАЎКАХ

ЦК ВКП(б) і СНК СССР у сваёй пастанове «Аб уборцы і загатоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў» забаранілі калгасам, калгаснікам і аднаасобным гаспадаркам продаж на старану бульбы аж да выканання сваіх абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве.

Многія перадавыя калгасы Мінскай вобласці з чэсцю выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай і ў першую чаргу здаюць гародніну і бульбу на загатоўчыя пункты. Аднак у цэлым загатоўка гэтых прадуктаў праходзіць па вобласці марудна. Асабліва адстае Мінскі раён. На 15 жніўня план здачы бульбы выкананы толькі на 34,7 проц., а па гароднине—на 24,7 проц. Гэтыя далёка нездавальняючыя лічбы гавораць аб тым, што ў раёне адсутнічае сістэматычны кантроль з боку партыйных і савецкіх арганізацый за ходам выканання дзяржаўных паставак, што загатавіцельныя органы пусцілі гэты адказнейшы ўчастак работы на самацёк.

Старшыня Мінскага раённага совета тав. Герман і райупаўнаркамзаг тав. Алейнікаў не прынялі рашучых мер да спынення антыдзяржаўнай практыкі радуу старшынь калгасаў. Факт-жа, што старшыні калгасаў: імені ДПУ—тав. Карбановіч, «Адраджэнне»—тав. Гурскі (Прыгарадны сельсовет), «Большэвік»—тав. Марфіс (Самахвалавіцкі сельсовет), «Першая конная»—тав. Малашэвіч (Новадворскі сельсовет) захапіліся рэалізацыяй прадукцыі па спекулятыўных цэнах і не выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай, зрываючы гэтым самым забеспячэнне насельніцтва гарадоў гародніной і бульбай.

Раённыя арганізацыі не палічылі патрэбным прыцягнуць гэтых злосных зрыўшчыкаў дзяржаўных паставак да найстражэйшай адказнасці і сталі на шлях нарушэння пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР. Работнікі загатоўчага апарата Мінскага раёна і вобласці адчуваюць сябе ў ролі тэхнічных прыёмшчыкаў, яны не змагаюцца за выкананне калгасамі планаў дзяржаўных паставак і закупак бульбы.

Мінскі абласны Совет дэпутатаў працоўных 19 жніўня заслухаў на сваім пасяджэнні пытанне аб ходзе выканання пастаноў СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб абавязковых пастаўках гародніны і бульбы дзяржаве» і «Аб уборцы і загатоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў» і вынес рашэнне аб прыцягненні да судовай адказнасці старшынь калгасаў Малашэвіча, Карбановіча, Гурскага і Марфіса за сістэматычнае нарушэнне закона аб першачарговай здачы гародніны і бульбы дзяржаве.

Мінскаму райсовету прапанавана прыцягнуць да адказнасці райупаўнаркамзага тав. Алейнікава за непрыняцце мер да выканання дзяржаўных паставак.

Аблвыканком абавязаў старшынь выканкомаў райсоветаў дэпутатаў працоўных забяспечыць поўнае выкананне плана здачы гародніны і бульбы дзяржаве кожным калгасам і калгаснікам, кожнай аднаасобнай гаспадаркай.

Сяўба азімых

ГОМЕЛЬ. У калгасах вобласці пачалася масавая сяўба азімых. На 23 жніўня засеяна звыш 2 тысяч гектараў.

Арганізавана праходзіць сяўба ў Журавіцкім раёне. Калгас «Шлях да сацыялізма» засеяў звыш 50 гектараў жыта. Сяўба праводзіцца радковымі сеялкамі, высокасортным насеннем.

Сяўба азімых на 90 проц. павінна быць праведзена радковымі сеялкамі. Аднак многія МТС яшчэ не адрамантавалі сеялак. У Лоеўскім раёне з 35 сеялак адрамантавана — 10. Такое-ж становішча і ў Святлагорскім, Веткаўскім і радзе іншых раёнаў вобласці.

Антыдзяржаўная практыка

БАРЫСАЎ. (Спец. кар. «Звязды»). Своечасовае выкананне дзяржаўнага плана зернапаставак — першая запаведзь кожнага калгаса. Усякі, хто затрымлівае выкананне зернапаставак, робіць антыдзяржаўную справу.

ЦК ВКП(б) і СНК СССР ў пастанове «Аб уборцы і загатоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў» устанавілі, што адлічэнне зярна для выдачы авансаў калгаснікам і на ўнутрыгаспадарчыя патрэбы калгасаў на час уборкі і да выканання плана загатовак дазваляецца ў размеры 15 процантаў ад фактычна здадзенай на дзяржаўныя загатоўчыя пункты колькасці зярна.

Асобныя-ж старшыні калгасаў Барысаўскага раёна сталі на антыдзяржаўны шлях. Так, напрыклад, старшыня калгаса імені Варашылава, Бродаўскага сельсовета, тав. Мацюша разлаў калгаснікам на працадні 2 тоны 536 кілограм зярна. Да рэчы, пры размеркаванні дапушчана поўная ўраўнілаўка. Калгаснікі, выпрацаваўшыя нязначную колькасць працадзён, атрымалі авансам больш, чым тыя, хто працаваў чэсна і добрасумленна. Нікалай Гайдалёнак, які выпрацаваў 197 працадзён, атрымаў авансам 79 кілограм зярна, а Іван Сазаёнак, які выпрацаваў 660 працадзён, — 59 кілограм.

Старшыня калгаса «Чырвоная Каліна», Вялыцкага сельсовета, В. Лінніцкі раздаў авансам на працадні 1.700 кгр. зярна.

А між тым, ні першы, ні другі калгас не здалі дзяржаве ні аднаго кілограма зярна. Гэтыя факты гавораць аб тым, што ў Барысаўскім раёне не вядзецца барацьба з нарушальнікамі інтарэсаў дзяржавы.

Пасля гэтага не дзіўна, што на загатоўчыя пункты Заготзярно ад калгасаў паступае нязначная колькасць зярна — не больш 40—45 тон у дзень замест 120 тон па плану.

Партыйныя і савецкія арганізацыі абавязаны прыняць усе меры к таму, каб зернапастаўкі былі выкананы своечасова.

ТЭЛЕГРАМЫ

Паветраныя баі над Англіяй

ЛОНДАН, 24 жніўня. (ТАСС). Міністэрствы авіяцыі, унутраных спраў і ўнутранай безапаснасці паведамляюць, што на працягу ночы на 23 жніўня непрыяцельскія самалёты рабілі паветраныя налёты на Англію. Над розными раёнамі Англіі і Паўднёвага Уэльса, а таксама над адным з гарадоў Паўночна-Усходняй Шатландыі, скінуты бомбы. Некалькі бомб скінута блізка ад Лондана. Пашкоджаны дамы. Ёсць невялікая колькасць афяр. У двух гарадах Паўночна-Усходняй Англіі пашкоджаны прыватныя ўладанні. Ёсць таксама нязначныя пашкоджанні ў двух гарадах Паўднёва-Усходняй Англіі.

У час паветраных баёў 22 жніўня было збіта дзевяць непрыяцельскіх самалётаў. 7 з іх былі збіты нашымі знішчальнікамі, а 2 зенітнай артылерыяй. Чатыры нашы знішчальнікі загінулі, але два лётчыкі выратаваны. Адзін непрыяцельскі бамбардыроўшчык збіт учора раніцой.

Заява Рузвельта па пытанню аб увядзенні абавязковай воінскай павіннасці

НЬЮ-ЙОРК, 24 жніўня. (ТАСС). Выступаючы на прэс-канферэнцыі, Рузвельт настойваў на прыняцці кангрэсам законапраекта аб абавязковай воінскай павіннасці на працягу бліжэйшых двух тыдняў. Ён заявіў, што кангрэс разглядае законапраект ужо два месяцы, і калі не прыме ў бліжэйшы час рашэння, — ажыццяўленне праграмы абароны будзе адтэрмінавана на год. Рузвельт выказаўся супроць прапануемай сенатам адтэрміноўкі ўвядзення абавязковага ваеннага навучання да наступнага года.

Ён указаў, што амерыканская армія і нацыянальная гвардыя налічваюць прыкладна 400 тысяч чалавек. Армія мае на мэце павялічыць свой састаў на працягу года да 1.200 тысяч чалавек. Рузвельт прачытаў прадстаўнікам друку мемарандум ваеннага міністра ЗША Стымсона, указваючага, што пры пяперашнім тэмпе ўступлення добраахвотнікаў у армію патрэбуецца год для павелічэння арміі і яе рэзерваў на 400 тысяч чалавек. Стымсон у мемарандуме адзначыў, што арміі патрэбна дадаткова 400 тысяч чалавек толькі для дапаможных войск.

Апошнія манёўры арміі, заявіў Рузвельт, сведчаць, што надта многа ўдзельнікаў не мае патрэбнай загартоўкі.

ПЕРАГАВОРЫ ЎРАДА ЗША З КАНАДАЙ І АНГЛІЯЙ

НЬЮ-ЙОРК, 24 жніўня. (ТАСС). Амерыканскі друк увогуле адабраюча адносіцца да перагавораў Рузвельта з прадстаўнікамі Канады і Англіі, але нехалькі заклапочан тым, што невядомы іх падрабязнасці. Газета «Нью-Йорк таймс» настойвае, каб Рузвельт інфарміраваў грамадскасць аб характары прапанаванага пагаднення з Канадай і перадаў канчатковае пагадненне на разгляд сената. Карэспандэнт газетнага трэста Скрыпс Говард Клепер патрабаваў, каб Рузвельт запэўніў, што ён не падрыхтоўвае прыняцця рашэнняў аб аказанні Англіі дапамогі на моры апрача пасылкі 50 «устарэўшых» эсмінцаў. Паводле слоў карэспандэнта, некаторыя амерыканцы апасаюцца, што перагаворы аб пасылцы ў Англію эсмінцаў скрываюць больш шырокія абавязацельствы.

З Вашынгтона паведамляюць, што саветнікі Рузвельта прабуюць знайсці зручныя спосабы заключыць з Канадай абаронча пагадненне, перадаць Англіі эсмінцы, атрымаць у арэнду марскія базы і вырашыць іншыя англа-амерыканскія пытанні без кансультацыі з сенатам, апасаючыся, што спрэчкі ў кангрэсе адаб'юцца на перадвыбарнай кампаніі і адтэрмінуюць аказанне дапамогі Англіі. Хоць амерыканская канстытуцыя прадугледжвае адабрэнне сенатам усіх дагавораў, многія важнейшыя пагадненні ЗША з замежнымі дзяржавамі былі заключаны без кансультацыі з сенатам, паколькі яны называліся «пагадненнямі», а не «дагаворамі».

Па словах газеты «Нью-Йорк таймс», «у апошнія дні ў кангрэсе расце непакой з повазу таго, што пагадненне з Канадай з'яўляецца першым крокам на шляху да ваеннага саюза з Англіяй. Дзяржаўны дэпартамент паспешна абвяргае паведамленні, што ЗША згодзяцца на афіцыяльны саюз з Англіяй». Не гледзячы на абвяржэнні, непакой прадаўжаецца.

Газета «Нью-Йорк сэн» падкрэслівае, што спроба Рузвельта заключыць саюз з замежнай дзяржавай без адабрэння сената можа выклікаць рэзкі палітычны канфлікт.

Журнал «Нью-рыпаблік» сцвярджае, што пасылка Рузвельтам у Англію ваеннай місіі сведчыць аб падрыхтоўцы цеснага супрацоўніцтва паміж ЗША і Англіяй. Журнал сцвярджае, што «без кансультацыі з кангрэсам Рузвельт можа аказаць істотную дапамогу Англіі, узяўшы на сябе частковае патруліраванне Атлантычнага акіяна, аслабаніўшы тым самым для іншых задач англійскія ваенныя караблі, якія знаходзяцца у Заходнім поўшар'і».

Газеты адкрыта абмяркоўваюць розныя формы ваенна-марской дапамогі Англіі, але лічаць за лепшае, каб ЗША захавалі свабоду дзеянняў, не аб'яўляючы вайны Германіі і не далучаючыся афіцыяльна ў якасці саюзніка да Англіі.

Хэрст заявіў, што ўступленне ЗША ў вайну «як відаць вельмі блізка». Ён сцвярджае, што ЗША магчыма ўступяць у вайну да лістападаўскіх выбараў і адабрае пагадненне аб узаемадапамозе з Канадай, але заяўляе, што гэта пагадненне прымусіць ЗША больш абараняць Канаду, чым Канада будзе абараняць ЗША, «калі толькі пагадненне не прадугледжвае супрацоўніцтва англійскага флота ў абароне Заходняга поўшар'я. У гэтым выпадку ЗША будуць саюзнікамі не толькі Канады, але і Брытанскай імперыі».

Нарада актыва работнікаў лёгкай прамысловасці БССР

24 жніўня ў Мінску адкрылася трэцяя ўсебеларуская нарада актыва работнікаў лёгкай прамысловасці. Прысутнічаюць кіраўнікі трэстаў, дырэктары прадпрыемстваў, лепшыя рацыяналізатары і стахановы — усяго 600 чалавек.

З дакладам аб выніках работы лёгкай прамысловасці ў першым паўгоддзі 1940 года выступіў нарком лёгкай прамысловасці БССР тав. Курган.

Дакладчык адзначыў, што сёлета лёгкая прамысловасць БССР павінна выпусціць прадукцыі на 370 мільёнаў рублёў. Ална швейная прамысловасць дасць на 148,5 млн. руб. швейных вырабаў, абуткозая прамысловасць — 6.850 тыс. пар абутку — на 550 тыс. пар больш, чым у 1939 г. Уся лёгкая прамысловасць рэспублікі павінна сёлета выпусціць прадукцыі на 11,5 млн. рублёў больш, чым у мінулым годзе.

Рад прадпрыемстваў па-большэвіцку змагаецца за выкананне сваіх планаў. Мінскі шклозавод «Пролетарый» поўгадавы план выканаў на 102,3 проц.. абутковая фабрыка імені Тэльмана — на 112,6 проц., швейная фабрыка «Кастрычнік» — на 118,1 проц. Гэтыя прадпрыемствы не адстаюць і ў трэцім квартале.

Аднак, у цэлым па наркамату план першага паўгоддзя недавыкананы на 6,8 проц. Значна адстаюць шклозаводы «Ноўка» і «Комінтэрн», абутковыя фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» і «Прагрэс». Невыкананне плана тлумачыцца слабым тэхнічным кіраўніцтвам, дрэннай арганізацыяй тэхналагічнага працэса, недастатковай барацьбой з прагульшчыкамі і дэзарганізатарамі вытворчасці.

У заключэнне тав. Курган падрабязна спыніўся на задачах па далейшай барацьбе за поўнае ажыццяўленне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня.

Нарада будзе працаваць тры дні. У яе рабоце прымаюць удзел намеснік наркома лёгкай прамысловасці СССР тав Бібікаў і дэлегацыя работнікаў лёгкай прамысловасці брацкай Украінскай ССР. (БЕЛТА).

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

У замежным друку паявіліся паведамленні аб тым, што быццам Савецкі Ўрал гэтымі днямі патрэбаваў у Турцыі згоды на праход совецкага флота праз Дарданелы ў выпадку вайны ў раёне Балканскага поўвострава.

ТАСС упоўнаважан заявіць, што гэтыя паведамленні з'яўляюцца поўнасцю выдумленымі.

Па Совецкай краіне

ЗБУДАВАННЕ ПОМНІКА МАЯКОЎСКАМУ

Па рашэнню Совета Народных Камісараў СССР у Маскве збудоўваецца помнік лепшаму паэту нашай эпохі В. В. Маякоўскаму. Закладка помніка, як вядома, адбылася ў 10-ю гадавіну з дня смерці паэта на плошчы, носячай яго імя.

Камітэт па справах мастацтваў пры Саўнаркоме СССР аб'явіў адкрыты ўсесаюзны конкурс на распрацоўку эскізнага праекта.

Тэрмін прадстаўлення праектаў на конкурс—25 снежня. Для разгляду праектаў утворана журы ў саставе вядомых пісьменнікаў, скульптараў, архітэктараў, мастакоў, мастацтвазнаўцаў.

Конкурсныя праекты будуць выстаўлены для публічнага абмеркавання на двух выстаўках—да зацвярджэння прэмій і пасля зацвярджэння прэмій водзывамі журы.

У сувязі з праектыраваннем помніка В. В. Маякоўскаму Камітэт па справах мастацтваў, Оргкамітэт Саюза совецкіх мастакоў, Саюз совецкіх архітэктараў і Саюз совецкіх пісьменнікаў наладжваюць творчую сустрэчу мастакоў, скульптараў, архітэктараў і пісьменнікаў. Яна адбудзецца 27 жніўня ў Цэнтральным доме работнікаў мастацтваў СССР. Пісьменнік-ордэнаносец Н. Н. Асееў зробіць даклад на тэму «Вобраз Уладзіміра Маякоўскага». Начальнік Упраўлення праектыравання выканкома Моссовета архітэктар ордэнаносец Д. Н. Чэчулін выступіць з дакладам «Архітэктурны ансамбль плошчы Маякоўскага». (ТАСС).

НОВЫ ЗАВОД ПА АПРАЦОЎЦЫ КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ

СКОПІН (Разанская вобласць). Паблізу горада будуецца завод Наркамата каляровай металургіі СССР. Завод будзе выпускаць трубы і прутки з каляровых металаў для розных галін прамысловасці. Першая чарга завода ўступіць у строй у будучым годзе.

Па гарадах Совецкага Саюза. На здымку: плошча Стачак у Ленінградзе.
Фото Р. Мазелева. (Фотакліше ТАСС).

АДКРЫЦЦЁ ФОТАВЫСТАЎКІ Ў ТАЛІНЕ

ТАЛІН, 23 жніўня. (ТАСС). Сёння ў Доме мастацтваў адкрылася вялікая фотавыстаўка, прысвечаная прыняцці Эстонскай ССР у саставу Совецкага Саюза. На выстаўцы прадстаўлена больш двухсот вельмі добрых фотаздымкаў работы маскоўскіх фотамайстроў Н. Петрова і В. Тёміна.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічала звыш 400 чалавек. Сярод іх выконваючы абавязкі прэзідэнта рэспублікі прэм'ер міністр тав. Варэс, сакратары ЦК комуністычнай партыі Эстоніі тт. Сярэ і Руус, члены Паўнамоцнай Камісіі Дзяржаўнай думы Эстоніі, прадстаўнікі партыйных і прафсаюзных арганізацый Таліна.

Плода-ягадныя соўгасы ў Бесарабіі

У Каларашы і сяле Копанцы (Бесарабія) прыступлена да арганізацыі двух буйных плода-ягадных соўгасаў Галоўкансерва. Кожнай з гэтых гаспадарак адведзена па 3.000 гектараў зямлі. Заключаны дагаворы аб здачы прадукцыі загатоўчай канторы Украінскага кансервавага трэста.

АБСЕРВАТОРЫЯ Ў КАРПАТАХ

СТАНІСЛАЎ. На адной з самых высокіх гор Усходніх Карпат — «Чарнагоры», на вышыні ў 2026 метраў над узроўнем мора створана высокагорная геафізічная абсерваторыя. 25 чалавек будуць тут пастаянна весці метэаралагічныя назіранні. Абсерваторыя на Карпатах будзе першай з усіх метэаралагічных пунктаў СССР фіксіраваць набліжэнне цыкланічных і франтальных фарміраванняў, якія большай часткай заваражаюцца над тэрыторыяй Заходняй Еўропы. Супрацоўнікі абсерваторыі будуць весці таксама актынаметрычныя, атмасферна-электрычныя, астранамічныя і геамагнітныя назіранні.

АПАРАТ, ЯКІ ДРУКУЕ ФІЛЬМЫ

На Маскоўскім вопытным заводзе кінаапаратуры закончана распрацоўка канструкцыі новага апарата для капіравання гукавых вузкаплёначных фільмаў. Гукавы запіс з негатыва пераводзіцца на копію пры дапамозе аптычнага прыбора з ультрафіялетавым святлом. Гэта значна павышае якасць копій фільмаў. За гадзіну апарат можа надрукаваць каля трох тысяч метраў плёнкі.

У верасні завод прыступіць да вырабу вопытнага капіравальнага апарата.

ДВА УРАДЖАІ Ў ГОД

АЛМА-АТА. Казахскі навукова-даследчы інстытут земляробства ў бягучым годзе ўпершыню заклаў вопыты пажніўных пасеваў у Свердлоўскім, Алма-Ацінскім і Туркестанскім раёнах. Пасля ўборкі азімых на гэтых плошчах высеяны проса, пшаніца, ячмень і кукуруза. Паўторныя пасевы добра развіваюцца. У сельгасарцелі «Кумжата», Свердлоўскага раёна, проса выкінула мяцёлку. На ўчастку зроблен першы вегетацыйны паліў; праводзіцца падкормка.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

РОСТ КОМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВА

У рашэннях XI пленума ЦК ВЛКСМ гаворыцца: «Лічыць важнейшай задачай комсамола ўпягненне ва ўсю работу комсамольскіх арганізацый шырокай масы комсамольцаў.

Устанавіць, што дзейнасць кіруючых комсамольскіх органаў павінна будавацца ў асноўным на прыцягненні да ўсёй работы шырокага комсамольскага актыва».

У адпаведнасці з гэтым рашэннем палітаддзел Калінкавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі стварыў камісіі па агітацыйна-прапагандысцкай рабоце, па рабоце сярод школьнай моладзі і піянераў, па ваенна-фізкультурнай рабоце, па культурна-масавай рабоце.

Пры падборы членаў камісій мы імкнуліся прыцягнуць да актыўнай работы перадавых, палітычна пісьменных маладых і па комсамольскаму стажу і па ўзросту таварышоў.

З 28 чалавек, якія ўвайшлі ў састаў камісій, восемнаццаць 1924—1920 гг. нараджэння і дзесяць чалавек — 1919—1914 гг. 17 таварышоў упершыню ўдзельнічаюць у актыўнай комсамольскай рабоце.

Комсамолец В. Галавач раней ніколі не выконваў комсамольскіх даручэнняў. Зараз ён запверджан намеснікам старшыні камісіі па рабоце сярод школьнай моладзі і піянераў.

— У мяне паявіўся новы прыліў энергіі і ініцыятывы, — гаворыць тав. Галавач, — хочацца сябе апраўдаць на гэтай рабоце. За даручаную справу адчуваю вялікую адказнасць.

Як-жа новастворваныя камісіі прыступілі да работы?

Камісія па агітацыйна-прапагандысцкай рабоце (старшыня слесар-стаханавец дэпо тав. Жавора) перш-на-перш скансцэнтравала галоўную ўвагу на падцягненне работы 4 буйных комсамольскіх арганізацый.

Сам тав. Жавора займаецца зараз наладжваннем агітацыйна-прапагандысцкай работы ў комсамольскай арганізацыі дэпо. Ён штодзённа гутарыць з комсамольцамі аб іх вучобе. У працэсе гутаркі ўстанавіў, што многія комсамольцы (тт. Голад, Краўчанка, Ткач) не вучацца. Па ўзроўню сваёй падрыхтоўкі 15 комсамольцаў могуць вывучаць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», але яны не маюць нават падручніка. Пасля гутаркі гэтыя таварышы набылі кнігі і ўзяліся за вучобу. Зараз тав. Жавора рыхтуе кансультацыі па першаму і другому разделах «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Такую-ж работу праводзіць тав. Гізенцвей у комсамольскай арганізацыі ст. Калінкавічы, тав. Ярмош — у комсамольскай арганізацыі ст. Жыткавічы.

22 жніўня праведзена таварыскае сувяседаванне па IV разделу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Пікава адзначыць, што комсамольскія арганізацыі сталі звяртацца ў камісію з просьбай, каб да іх накіравалі лектараў. Комсамольцы выказалі жаданне ў бліжэйшыя дні праслухаць лекцыі аб комуністычнай маралі, аб дыялектычным матэрыялізме, аб Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Зараз камісія падбірае лектараў. Лекцыю аб комуністычнай маралі прачытае тав. Жавора, аб дыялектычным матэрыялізме — настаўнік, член камісіі тав. Марчанка. Члены камісіі па агітацыйна-прапагандысцкай рабоце самі старанна вучацца.

Нядрэнна працуе таксама камісія па рабоце сярод школьнай моладзі і піянераў (старшыня тав. Трапко). Камісія пачала з наладжання работы піянерскіх фарпостаў. Калі ў чэрвені фарпосты не прапавалі, то ў ліпені пры дапамозе камісіі работа фарпостаў значна ажывілася.

Другое, чым занялася камісія, — гэта падрыхтоўка школ адзяслення да новага вучэбнага года. Члены камісіі з удзелам комсамольцаў праверылі, як праходзіць рамонт школ, аказалі дапамогу ў арганізацыі рэпетытарскіх груп. Таварышы дабіліся, што ўсе комсамольцы, якія маюць іспыты па асобных дысцыплінах на восень, актыўна наведваюць заняткі рэпетытарскіх груп. Да навучаючыхся, якія не хацелі наведваць заняткі, хадзілі на дом, гутарылі з імі, з іх бацькамі. Зараз усе яны наведваюць заняткі рэпетытарскіх груп, рыхтуюцца да іспытаў.

З дапамогай комсамольцаў члены камісіі Бурак І., Галавач В. правяраюць, ці ўсе дзеці вузла і палявых станцый ахвачаны школай.

Камісія па ваенна-фізкультурнай рабоце рыхтуе комсамольска-маладзёжны паход у прапівагазах і ваенна-тактычную гру. Аднак гэта камісія (старшыня тав. Нігрэвіч) вельмі марудна разгортвае сваю работу. Таксама слаба працуе і камісія па культурна-масавай рабоце (старшыня камісіі тав. Казлоў).

Штодзённа вечарам старшыні камісій і іх намеснікі па чарзе дзяжурыць у палітаддзеле па 2 гадзіны. Яны прымаюць наведвальнікаў, звязваюцца з пярвічнымі комсамольскімі арганізацыямі, выклікаюць на гутаркі комсамольцаў і т. д.

Пасля стварэння камісій уся комсамольская работа прыкметна палепшылася, і значна лягчэй стала працаваць мне, як памочніку начальніка палітаддзела па комсамолу. Павысілася актыўнасць многіх радавых комсамольцаў. Тт. Каламеец, Мужэнка, Салаўха, Кастроў і многа іншых комсамольцаў раней ніякіх даручэнняў не выконвалі, а зараз яны актыўна ўзяліся за работу ў пярвічных арганізацыях. Пасля рашэнняў пленума пачалі актыўна ўдзельнічаць у комсамольскім жыцці 65 маладых комсамольцаў.

Расце і вытворчая актыўнасць комсамольцаў і несаюзнай моладзі, іх удзел у ізяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці. Комсамольска-маладзёжная брыгада дэпо Калінкавічы стала стаханаўскай. Брыгада заўсёды датэрмінова выпускае з рамонту паравозы. 11 жніўня яна выпусціла з рамонту два паравозы ў адну змену. Брыгадзір гэтай брыгады тав. Міхеенка ўзнагароджан наркомам Л. М. Кагановічам значком «Почетному железнодорожнику».

Змена комсамольца-дзяжурнага па станцыі тав. Шамвановіча заваявала першынства ў сацыялістычным спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Комсамольцы-токары тт. Аладенка, Салаўха, Раманенка выконваюць вытворчую норму на 330—350 процантаў штодзённа. Электразварщык тав. Леўлюх таксама дае больш 300 проц. нормы.

Зараз комсамольскія арганізацыі нашага аддзялення рыхтуюцца да справаздач і выбараў комсамольскіх органаў. Падрыхтоўка і самі выбары будуць садзейнічаць поўнай перабудове работы комсамольскіх арганізацый у адпаведнасці з рашэннямі XI пленума ЦК ВЛКСМ.

М. КІТАЙЧЫК,
памочнік начальніка палітаддзела па комсамолу Калінкавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі.

ЯК У ВАГОННЫМ ДЭПО АБАРАНЯЛІ ПРАГУЛЬШЧЫКА

З мінуты на мінуту павінен адыйсці кур'ерскі поезд. Ужо вышаў на перон, каб адправіць састаў, дзяжурны па вакзалу. Машыніст у чаканні сігнала нецярпліва паглядае на апушчаны жэзл у руках дзяжурнага. Усё гатова. І раптам выясняецца, што на работу не з'явіўся паязны электраманцёр Мірановіч. Начальнік поезда катэгарычна адмаўляецца ехаць без манцёра, пагражае затрымка поезда. У пажарным парадку выклікаецца запасны манцёр, і поезд адпраўляецца.

Напярэдадні Мірановіч па асабістых справах без усяжага дазволу выехаў у Маладзечна і своечасова не з'явіўся на работу. Прагул у наяўнасці. Усё ясна. Майстар электрацэха член ВКП(б) тав. Мурашка піша начальніку дэпо рапарт, у якім указвае на прагул манцёра і просіць прыцягнуць яго да судовай адказнасці. Начальнік дэпо згаджаецца і справа афармляецца для перадачы ў суд. Усё зроблена па закону.

Але не тут-та была. Аказваецца, у дэпо ёсць «нядрэмлючае вока», якое ўсё бачыць і ўсімі сіламі стараецца выгаразіць і абараніць дэзарганізатараў вытворчасці. Сядзіць яно ў кабінеце партыйнага бюро і займае высокі пост сакратара.

— Хто даў права без майго дазволу перадаваць справу ў суд?—грозна пытае «нядрэмлючае вока», ён-жа сакратар партыйнага бюро тав. Камлёў.

— Як можна без ведама профарганізацыі аддаваць пад суд членаў профсаюза? —заяўляе ў тон яму старшыня мясцкома тав. Кадолка. — Я буду да канца абараняць правы членаў профсаюза.

— Дзе-ж прагул? — пытаюць яны ў унісон. Поезд пайшоў своечасова, і аблылася звычайная ў нас замена нез'явіўшагася рабочага.

У запале абурэння заўзятыя абаронцы прагульшчыкаў накіроўваюцца да пракурора Каганавіцкага раёна. Тут яны, апрача Мірановіча, бяруць пад абарону яшчэ двух прагульшчыкаў — Таргонскага і члена Камітэта ВЛКСМ Забеліну, якая спазнілася з водпуска на двое сутак. Пракурор прызнаў прагулы даказанымі і патрабаваў прыцягнення нарушальнікаў Указа да адказнасці.

Панярпеўшы першую няўдачу, ваяўнічыя абаронцы сталі дзейнічаць больш рашуча. У партбюро выклікаецца майстар электрацэха тав. Мурашка, які пісаў раней рапарт начальніку дэпо аб прагульшчыку Мірановічу. Тут пад націскам высокапастаўленых таварышоў, пад іх дыктоўку ён піша даведку, якая выгараджвае прагульшчыка. Член партыі тав. Мурашка зрабіў злачынства перад краінай, падпісаўшы брудную страпню.

Але на гэтым справа не скончылася. Падзеі разгортваюцца з усё нарастаючай быстрынёй. У дзень суда над прагульшчыкам яго патуральнікі выклікаюць члена партбюро тав. Крук і прапануюць яму пайсці на судовае пасяджэнне і выступіць ад імені партыйнага бюро і мясцкома ў якасці сведкі, гэта значыць абаронцы злоснага прагульшчыка. Камлёў і Кадолка прадбачаць хуткую «перамогу». Уведзены ў заблуджэнне суд апраўдвае Мірановіча. Камлёў і Кадолка таржаствуюць, але нядоўга.

21 жніўня партыйны сход вагоннага дэпо абмяркоўваў рашэнні ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б). Сход ускрыў абурачыя нарушэнні Указа ад 26 чэрвеня. За кароткі тэрмін зрабілі прагулы 27 чалавек. Кіраўніцтва партыйнай арганізацыі безадказна аднеслася да важнейшай дзяржаўнай справы, стала на шлях яўнага патурання прагульшчыкам і дэзарганізатарам вытворчасці. Масава-палітычная работа сярод рабочых дэпо на нізкім узроўні. У цэхах многа прастояў, не наладжана забеспячэнне рабочых матэрыяламі і інструментамі.

Партыйны сход з усёй большэвіцкай строгасцю асудзіў гнілыя, антыпартыйныя паводзіны Камлёва і Кадолка. Сход адобрыў рашэнне палітаддзела чыгункі аб знятні тав. Камлёва з работы сакратара партбюро, вывеў яго з складу бюро і абвясціў строгую вымову з папярэджаннем. Абвешчаны вымовы т. Кадолка і майстру тав. Мурашку. Сход указаў таксама на беспрынцыповыя паводзіны члена партбюро, начальніка дэпо тав. Мішчука, які велаў аб злачынствах Камлёва і Кадолка, але не прыняў своечасова неабходных мер.

Астаўся беспакараны прагульшчык Мірановіч. Трэба думаць, што пракурор Каганавіцкага раёна папоўніць гэты прабел.

М. ПАУЛЮЧЭНКАЎ.

Комсамольцы-прызыўнікі машынабудаўнічага завода імені Дзімітрава (Магілеў), якія гуюцца дастойна сустрэць дзень прызыва ў рады РСЧА. Яны выконваюць нор 200—300 проц., маюць па 3—4 абаронныя знакі. Злева направа: прыёмшчык Г. К. панаў, фармаўшчык А. Н. Касіраў, слесары Л. Г. Масленкоў і Я. М. Туфельд і Г. Я. Мануйла.
Фото К. Якубовіча. (Фотахроніка БЕЛТ).

ГАТОВЫ СТАЦЬ НА АБАРОНУ РАДЗІМЫ

Прызыў у Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот—вялікая падзея ў нашай краіне. Прызыў паўсямесна прахозіць як вялікае свята. Наша слаўная моладзь з нецярпеннем чакае таго дня, калі яна стане пад баявыя сцягі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Вялікая чэсць быць байцом гераічнай Чырвонай Арміі, арміі, разграміўшай у гады грамадзянскай вайны белагвардзейскія полчышчы, выгнаўшай з совецкай зямлі замежных інтэрвентаў, арміі, пакрыўшай сябе неўвядальнай славай у баях з японскімі самураямі ў раёне возера Хасан і ля ракі Халхын-Гол, пры вызваленні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай.

Наша моладзь разумее, якія вялізарныя надзеі ўскладае на яе совецкі народ, совецкая дзяржава. Чырвонай Арміі патрэбны граматныя, вытрыманыя і фізічна моцныя людзі, добра падрыхтаваныя ў ваенных адносінах. Толькі такія кадры змогуць кіраваць магутнай тэхнікай, якою аснашчаны наша Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот, павялічваць яе баявую магутнасць, узвялічыць славу совецкай зброі.

Моладзь Совецкай Беларусі гатова прыняць на сябе гэту пачотную і адказную задачу і з чэсцю апраўдаць давер'е партыі, давер'е совецкага народа.

З кожным годам усё лепшае і лепшае папаўненне атрымлівае наша армія. У 1939 годзе ў ліку прызваных у Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот з Беларусі было членаў і кандыдатаў ВКП(б) 1,3 проц., комсамольцаў—21,2 проц., варашылаўскіх стралкоў—31 проц., значкістаў ПВХА — 31 проц., значкістаў ГСА—31 проц., значкістаў ГПА — 29,4 проц.

На прызыўныя пункты Беларусі сёлета прыезе моладзь значна лепш падрыхтаваная, граматная, фізічна здаровая, у большасці сваёй ведаючая ваенную справу. У ліку прызыўнікоў—3 проц. членаў і кандыдатаў ВКП(б), 47,2 проц. комсамольцаў.

Значна вышэй мінулых год і адукацыйны ўзровень прызыўнікоў. З агульнага ліку прызыўнікоў 3 проц. з вышэйшай асветай, 20,9 проц.—з сярэдняй асветай, 39,1 проц. —з няпоўна-сярэдняй і 35 проц. — да 5 класаў.

Большасць маладых патрыётаў, ідучых у гэтым годзе ў Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот, без адрыву ад вытворчасці авалодалі ваеннымі спецыяльнасцямі. 56 проц. прызыўнікоў з'яўляюцца варашылаўскімі стралкамі, 75 проц. здалі нормы ПВХА, 68 проц.—нормы ГСА і 43 проц. —нормы ГПА. Чырвоная Армія атрымае ў ліку прызыўнікоў добра падрыхтаваных шофераў, трактарыстаў, тэлефаністаў, радыстаў, снайпераў, парашутыстаў і лётчыкаў.

Лепшыя ўзоры падрыхтоўкі да п[illegible]ва ў гэтым годзе паказваюць Мінска[illegible] Палеская вобласці. Многія раёны [illegible] абласцей выдатна рыхтуюцца да пр[illegible] ў РСЧА. Напрыклад, у Капыльскім [illegible] на ўсіх прызыўнікоў ужо афармлен[illegible] кументы. Нормы ГСА здала 98 [illegible] прызыўнікоў, ПВХА—97 проц., [illegible] 91 проц. 90 проц. прызыўнікоў з'яўл[illegible] варашылаўскімі стралкамі. У [illegible] кім раёне таксама на ўсіх прызыў[illegible] аформлены дакументы. У раёне [illegible] ПВХА здала 89 проц. прызыў[illegible] ГСА—86 проц., «ВС»—76 проц.

Такіх раёнаў можна назваць дзеся[illegible]

Ці могуць думаць аб падобным п[illegible] ненні арміі капіталістычных к[illegible] Несумненна, не. Ім гэта не па пляч[illegible]

Баец Чырвонай Арміі з'яўляецца [illegible] зічна моцным, лоўкім, культурны[illegible] інтэлігентным. І гэта зусім натура[illegible] бо кожны працоўны нашай краіны [illegible] тае мудрыя ўказанні правадыра на[illegible] таварыша Сталіна аб тым, што мы з[illegible] ізімся ў капіталістычным акружэнні [illegible] наш народ павінен быць заўсёды ў [illegible] лізацыйнай гатоўнасці.

На Ўнечарговай IV Сесіі Вярхо[illegible] Совета СССР таварыш Варашылаў [illegible] рыў: «Совецкі Саюз не будзе засп[illegible] знянацку міжнароднымі падзеямі, я[illegible] яны ні былі раптоўны і грозны. А [illegible] паны, памутнёны розум якіх перашка[illegible] ім бачыць Совецкі Саюз такім, які [illegible] ёсць у сапраўднасці, нязменна бу[illegible] атрымліваць прадметныя ўрокі да [illegible] часу, пакуль яны не зразумеюць, [illegible] вялікі народ Совецкаў мае і заўсёды [illegible] мець сваю вялікую і страшную ў бар[illegible] бе з ворагамі ўзброеную сілу, якая [illegible] сакрушаць заўсёды і ўсіх, хто адважва[illegible] пасягаць на свяшчэнныя правы, з[illegible] і чэсць пабеднаснага Совецкага Сая[illegible]

Совецкі народ, партыя і ўрад не [illegible] цюць сіл і сродкаў для ўмацава[illegible] Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Ф[illegible] для падняцця мабілізацыйнай гатоўн[illegible] краіны. З кожным годам мацнеюць [illegible] броеныя сілы Совецкага Саюза, а раз[illegible] гэтым мацнеюць адзінства і баявая [illegible] вязь совецкага народа з сваёй Чырво[illegible] Арміяй і Ваенна-Марскім Флотам.

У верасні па ўсёй краіне пачне[illegible] прызыў у Рабоча-Сялянскую Чырво[illegible] Армію і Ваенна-Марскі Флот. Час, [illegible] астаўся, неабходна скарыстаць для я[illegible] большага разгортвання работы з прызы[illegible] нікамі. Значную работу павінны [illegible] рабіць партыйныя, комсамольскія, со[illegible] кія і грамадскія арганізацыі Віцебскай і [illegible] Магілеўскай абласцей, дзе падрыхтоўка [illegible] прызыва недастаткова разгорнута.

Трэба зараз-жа падабраць і афору[illegible] памяшканні для прызыўных пункт[illegible] разгарнуць там кансультацыйную і ма[illegible] вую работу.

С.В. КЛЮЧЫНСКІ,
намеснік загадчыка Ваеннага адд[illegible] ЦК КП(б)Б.

Сход партыйнага актыва горада Гродна

ГРОДНА, 24 жніўня (БЕЛТА). Адбыўся сход партыйнага актыва гродненскай гарадской партыйнай арганізацыі. Даклад аб выніках ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б) зрабіў сакратар гаўкома партыі тав. Пазнякоў.

Дакладчык адзначыў, што рад партыйных арганізацый горада не ўзяў пад свой штодзённы кантроль выканання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Асобныя комуністы робяць прагулы. Так, комуніст Харашылаў (партарганізацыя дэпо) зрабіў два прагулы. Комуніст Шкуркін (партарганізацыя кандуктарскага рэзерва) таксама зрабіў прагул. Абодва прагульшчыкі выключаны з радоў партыі. Кіраўнікі асобных прадпрыемстваў сталі на шлях патурання прагульшчыкам. Адначасова з накіраваннем справаў у суд для прыцягнення дэзарганізатараў вытворчасці да адказнасці яны даюць прагульшчыкам станоўчыя характарыстыкі.

У спрэчках выступіла 13 чалавек.

Тав. Сахрай у сваім выступленні адзначае, што некаторыя пярвічныя партарганізацыі яшчэ не зразумелі ўсёй адказнасці, якая перад імі стаіць у барацьбе за ажыццяўленне Указа. На шкляным і кафельным заводах не наладжан учот яўкі на работу. Дырэктар кафельнага завода Бяленька і сакратар партарганізацыі Голдава не ведаюць, што ўжо 20 дзён не выходзяць на работу шэсць чалавек. Часта рабочыя адпускаюцца з работы па прыватных запісках урачоў.

— На скурзаводзе № 5 —гаворыць тав. Шыпуноў,—да выканання Указа аднеслася фармальна. З прагульшчыкамі рашучай барацьбы не вядзецца.

Сход актыва аднадушна ўхваліў рашэнні Пленума і намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па іх ажыццяўленню.

Раённы партыйны сход

МАГІЛЕЎ. (Кар. «Звязды»). Адбыўся агульны сход партыйнай арганізацыі Магілеўскага раёна. З дакладам аб выніках ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б) выступіў сакратар райкома КП(б)Б тав. Жураў.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Дырэктар лестаса тав. Зарэцкі гаварыў на сходзе, што асобныя кіраўнікі раённых арганізацый самі робяць прагулы, а райком партыі прахозіць міма гэтых фактаў. Так, загадчык Магілеўскага райана тав. Собаль 27 ліпеня і 9 жніўня зрабіў прагулы. Партыйная арганізацыя, абгаварыўшы гэты факт на сваім сходзе, выключыла Собаля з партыі. Ён адлан пад суд. Аднак, прайшло ўжо нямала часу, а райком партыі не разглеўзеў яшчэ гэтага пытання.

Аб дрэнным ходзе ўборкі ў многіх калгасах раёна і нездавальняючай рабоце камбайнавага парка гаварыў у сваім выступленні загадчык райза тав. Лапацін. Магілеўская і Лупалаўская МТС дрэнна арганізацыяй праны на ўборцы наносяць страты дзяржаве. На полі астаецца многа калосся.

Усяго ў спрэчках выступіла 12 чалавек.

Партыйны сход цалкам і поўнасцю адобрыў рашэнне ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б) і абавязаў пярвічныя партыйныя арганізацыі і кожнага комуніста ўсю сваю работу накіраваць на выкананне яго рашэнняў.

Вахта імені Міжнароднага юнацкага дня

ГОМЕЛЬ, 23 жніўня. (БЕЛТА). У комсамольскіх арганізацыях Гомеля пачалася дзейная падрыхтоўка да святкавання Міжнароднага юнацкага дня. На запалкавай фабрыцы «Везувій», дрэваапрацоўчым камбінаце, тлушчакамбінаце комсамольцы становяцца на вахту імені МЮД. На заводзе «Гомсельмаш» на вахту сталі 37 комсамольцаў. Токар Бараноўскі, які працуе на абточны дэталей, дзённы план выконвае на 220 проц., токар Буднікаў—на 160 проц. Ён абточвае 16 каленчатых валаў замест 10 па плану.

На прадпрыемствах горада праводзяцца гутаркі, чыткі літаратуры аб Міжнародным юнацкім дні. Абком комсамола распрацаваў план святкавання. У парках, на стадыёнах і рапэ Сож адбудуцца масавыя народныя гулянні і масоўкі моладзі. 29 жніўня ў абласным тэатры адбудзецца маладзёжны вечар. 1-га верасня, у нядзелю, у горадзе адбудзецца дэманстрацыя.

НАПЯРЭДАДНІ СЛАЎНАЙ ГАДАВІНЫ

НА АБНОЎЛЕНАЙ ЗЯМЛІ КВІТНЕЕ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

(Гутарка з Народным Камісарам Земляробства БССР тав. І. А. КРУПЕНЯ)

Набліжаецца слаўная гадавіна — 17 верасня, калі вызвалены народ былой Заходняй Беларусі, устанавіўшы ў сябе совецкую ўладу, пачаў перабудоўваць сваё жыццё на новы лад. Змянілася ўсё навакол. Запрацавалі дзесяткі адбудаваных і пераабсталяваных фабрык і заводаў, абнавілася зямля, на якой выраслі 571 калгас, закрасавалі палі вызваленага сялянства.

Доўгачаканая мара сялян аб зямлі збылася. Выгнаны назаўсёды з краіны ненавісныя народу польскія паны, князі і графы радзівілы, мірскія, скірмунты, тышкевічы, любанскія, гарадынскія, якія валодалі сотнямі тысяч гектараў зямлі, і нажывалі на людскім поце і крыві незлічоныя багацці. Толькі па чатырох абласцях — Баранавіцкай, Пінскай, Вілейскай і Беластоцкай — налічвалася 2.852 буйныя маёнткі, якія мелі 1.580.955 гектараў зямлі. Шэсць буйнейшых памешчыкаў Вілейскай вобласці мелі 56.588 гектараў зямлі. А побач з імі на тэрыторыі той-жа вобласці марнелі 4.423 батракі, 33.830 бясконных і 12.846 бескароўных гаспаларак.

За год існавання совецкай улады ў заходніх абласцях былым батракам, малазямельным і беззямельным сялянам раздана 430 982 гектары былой панскай і асадніцкай зямлі. Сяляне атрымалі 14.086 коней, 33.400 кароў, многа свіней авечак і іншай дробнай жывёлы. Па адных толькі Баранавіцкай і Вілейскай абласцях сярод батракоў і бяднейшых сялян было размеркавана 10.285 свіней і 6.938 авечак.

Ужо ўвосень 1939 г. каля 20.000 батрацкіх і малазямельных гаспадарак упершыню пасеялі азімае жыта на сваёй зямлі, атрыманай ад совецкай улады. На абсемяненне зямлі калгаснікі, былыя батракі і беднякі Беластоцкай, Пінскай, Баранавіцкай і Вілейскай абласцей, атрымалі вясной 8.140 тон насення зерновых. Па Вілейскай, Баранавіцкай і Беластоцкай абласцях размеркавана сярод сялян 9.783 тоны насення бульбы. Два месяцы таму назад — напярэдадні ўборкі — сярод сялян былі размеркаваны тысячы гектараў пасеваў азімых, засеяных на былых панскіх і асадніцкіх землях.

Як вядома, у былой панскай Польшчы на вельмі нізкім узроўні была ветэрынарная справа. Яшчэ сап і іншыя заразныя хваробы знішчалі штогод нямала жывёлы. Совецкім ветэрынарным работнікам прышлося шмат папрацаваць, каб канчаткова ліквідаваць раскіданыя па ўсёй тэрыторыі ачагі заразных хвароб.

105 ветэрынарных урачоў і фельчароў было накіравана для работы ў заходніх абласцях. Адкрыта 5 абласных ветэрынарна-бактэрыялагічных лабараторый, 101 райветлячэбніца, 192 ветэрынарныя пункты. У ветэрынарныя лячэбніцы і пункты накіравана розных медыкаментаў на 412 тыс. рублёў і звыш 1.000 тон дэзінфіцыруючых сродкаў на суму 1.900.000 рублёў. 145 мясцовых ветэрынарных работнікаў прайшлі перападрыхтоўку і прыцягнуты да актыўнай работы па ветэрынарыі.

Наколькі вялікае значэнне надае дзяржава арганізацыі ветэрынарнай справы ў заходніх абласцях, відаць з таго, што на гэта па рэспубліканскаму бюджэту асігнавана 11.813 600 рублёў.

За месяц да пачатку веснавых работ 1940 г. у заходніх абласцях упершыню паявіліся магутныя совецкія сельскагаспадарчыя машыны — трактары. Была створана 101 МТС. У іх налічваецца 951 трактар, 193 аўтамашыны, 840 трактарных плугоў, 438 культываватараў, 228 дыскавых барон, 300 сеялак, 157 складаных і поўскладаных малатарань у соўгасах, арганізаваных на землях буйных памешчыкаў, паявіліся совецкія камбайны, на якія, як на цуда, збіраюцца глядзець сотні сялян з суседніх вёсак. У заходніх абласцях арганізуецца 101 машынна-трактарная майстэрня бягучага рамонту і 5 майстэрань капітальнага рамонту.

Разам з тэхнікай на калгасныя і сялянскія палі прыбылі вопытныя вялізецелі машын: 723 трактарысты, 191 механік. Для работы ў заходніх абласцях было накіравана 63 аграномы, зоатэхнікі, работнікі ўчоту і інш.

Яшчэ зімой у абласных і буйнейшых раённых цэнтрах былі адкрыты курсы па падрыхтоўцы рознастайных кадраў для сельскай гаспаларкі. На курсы прыязджалася моладзь, сяляне-актывісты, праявіўшыя сябе на рабоце ў сялянскіх камітэтах і часовых упраўленнях, а таксама на выбарах у вярхоўныя органы совецкай улады. На арганізацыю школ па падрыхтоўцы механікаў сельскай гаспаларкі было вызелена 2.600.000 рублёў. Па адной толькі Баранавіцкай вобласці на курсах навучаліся 52 камбайнеры і 258 трактарыстаў, сярод якіх 60 жанчын.

Па вялікія клопаты партыі і совецкай улады аб працоўных заходніх абласцей сяляне адказалі дружнай работай на сяўбе і ўборцы, узорнай працай у калгасах, барацьбой за высокія ўраджаі і датэрміновым выкананнем дзяржаўнага плана збожжапаставак. Гэта пацвярджаюць яркія прыклады гаспадарчых поспехаў калгасаў заходніх абласцей.

Калгас імені Сталіна, Пінскага раёна, у якім налічваецца 106 гаспадарак, да 1 жніўня закончыў уборку азімых і яравых, выперабіў лён і датэрміновa разлічыўся з дзяржавай па збожжапастаўках. У калгасе развіваецца гародніцтва і салоўніцтва. На бягучым рахунку гэтага калгаса налічваецца ўжо 20.000 рублёў. У калгасах імені Молатава, Жабчыцкага раёна, «Першае мая», Іванаўскага раёна і «Комунар», Давід-Гарадоцкага раёна паспяхова закончана ўборка, выкананы планы зернепаставак і засыпаны насенныя фонды. Калгаснікі сельгасарцелей «17 верасня», «Новае жыццё», «Чырвоная звязда» пракапалі на балоце 5 кіламетраў новых каналаў і асушылі ўжо 100 гектараў сенажаці.

Выдатныя ўзоры работы паказалі маладыя трактарысты, якія толькі вясной закончылі вучобу і ўпершыню селі за руль совецкага трактара. Трактарыст Жабчыцкай МТС тав Цэйко за 10 дзён выпрацаваў на трактары СТЗ-НАЦІ 134 гектары. Трактарыст Целеханскай МТС тав. Мацвеенка ўзараў 137 гектараў.

Вызваленае сялянства заходніх абласцей, стаўшы поўнаправным гаспадаром зямлі, змагаецца за скарыстанне кожнага кавалачка прыгоднай глебы, за расшырэнне пасеўнай плошчы. Па адной толькі Баранавіцкай вобласці пасеўная плошча яравых павялічылася на 43.298 гектараў, сераязлы — на 2.200 гектараў, лубіну — на 800 гектараў, тэхнічных культур — на 2.511 гектараў.

571 калгас арганізаваўся ў заходніх абласцях БССР. У гэтых калгасах 30.000 сялянскіх двароў. На сяўбе і ўборцы, як і пры выкананні свайго пярвейшага абавязку — дзяржаўных планаў збожжапаставак, калгаснікі праявілі сябе, як чэсныя і адданыя сацыялістычнаму будаўніцтву людзі, як людзі новай калгаснай вёскі. Яны дэманстрыруюць перад сялянамі-аднаасобнікамі сілу і магутнасці калгаснага ладу.

КЛАПАЦІЦЦА АБ ШКОЛАХ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

За апошнія годы мінскія сярэднія школы для дарослых павышанага тыпу скончыла без адрыву ад вытворчасці некалькі сот рабочых, работніц і працоўнай інтэлігенцыі. Толькі ў мінулым вучэбным годзе дзесятыя класы выпусцілі 129 чалавек. Некаторыя з выпускнікоў да паступлення ў школу былі прыбіральшчыкамі, хатнімі работніцамі, хатнімі гаспадынямі. Зараз пасля сканчэння школы яны паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, а многія вылучаны на кіруючую работу. Напрыклад, навучаючыяся школы № 8 тав. Жукоўскі, які раней прапаваў на ДЭС-2 качагарам, пярэп вылучан на пасаду начальніка аддзела снабжэння.

Гэта наглядна паказвае, якое вялікае значэнне набылі школы павышанага тыпу для дарослых у справе выканання пастаўленай партыяй гістарычнай задачы—палняцця культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа да ўзроўню работнікаў інжынерна-тэхнічнай працы і ажыццяўлення ўсеагульнай сярэдняй асветы ў краіне.

Але трэба адзначыць, што ў рабоце школ ёсць яшчэ многа недахопаў. У 1939—40 вучэбным годзе ў г. Мінску налічвалася 10 школ для дарослых і ні адна з іх не працавала нармальна. Школы №№ 3 і 13 каля месяца не працавалі з-за адсутнасці паліва і электрасвятла. Школа № 7 вымушана была туліцца ў памяшканні клуба глухаямых. Прыхозілася некалькім класам працаваць у адным пакоі. А пяты клас школы № 8 займаўся ў памяшканні кухні. Гарана-ж не зрабіў з усіх гэтых фактаў адпаведнага вывалу.

На сённешні дзень вячэрнія школы ўсё яшчэ знаходзяцца на правах пасынкаў: не маюць пастаянных памяшканняў. У бягучым годзе па плану намечана адкрыць адну пазменную школу. Ясна, што за ёю неабходна замацаваць пастаяннае памяшканне, бо заняткі трэба правозіць у дзве змены. Але школа яшчэ не мае памяшкання, і ні гарана, ні Варашылаўскі райана, на тэрыторыі якога павін[illegible] знаходзіцца школа, не вырашылі гэт[illegible] пытання.

Амаль ва ўсіх школах была дрэ[illegible] пастаўлена палітычна-выхаваўчая рабо[illegible] Асабліва гэта адчувалася ў школе № [illegible] Тут мелі месца хуліганскія ўчынкі не[illegible] торых навучаючыхся, але дырэкцыя ш[illegible] лы і прадпрыемствы, дзе працавалі [illegible] тыя людзі, не прынялі мер для спын[illegible] ня такіх з'яў.

Дарэчы, трэба адзначыць, што кіраў[illegible] кі прадпрыемстваў, партыйныя і ком[illegible] мольскія арганізацыі наогул недастатко[illegible] цікавяцца вучобай і паводзінамі сваіх [illegible] ботнікаў у школе, не клапоцяцца, к[illegible] яны паспяхова вучыліся. Больш та[illegible] асобныя т. т. залішне нагружаюцца [illegible] прадпрыемствах грамадскай работай, ч[illegible] ста ў гадзіны вучобы бязмэтна затрым[illegible] ваюцца. Такія факты мелі месца на фа[illegible] рыцы імені Крупскай. Рабочы тав. Ульн[illegible] наў вымушан быў прапускаць заняття[illegible] бо затрымліваўся адміністрацыяй.

Сопспаборніцтва ў разе школ (№№ [illegible] 6, 7) не было разгорнута. У другім па[illegible] годзі ў школе № 5 лагаворы на сопсп[illegible] борніцтва зусім не заключаліся і толь[illegible] пасля заўваг інспектара яны паспех скл[illegible] даліся на ўроках. У выніку сопспаборні[illegible] тва насіла чыста фармальны характар[illegible] не з'яўлялася стымулам палняцця пл[illegible] цыпліны і паспяховасці вучняў.

Сур'ёзнейшым недахопам у рабоце вя[illegible] чэрніх школ з'яўляецца адсутнасць на[illegible] глядзнасці на ўроках. Не практыкуюцца [illegible] тоследы па дакладных навуках — хімі[illegible] прыродазнаўству, не гледзячы на тое, шт[illegible] прыборы і ўсе дапаможныя прылады ёсць[illegible]

Праз некалькі дзён пачнецца новы вуч[illegible] чэбны год. Задача кіраўнікоў школ, прад[illegible] прыемстваў, партыйных і комсамольскіх [illegible] арганізацый, настаўнікаў — забяспечыць [illegible] паспяховую і плённую вучобу слухачоў [illegible] вячэрніх школ.

М. ПРАТУСЕВІЧ,
інспектар школ для дарослых павышанага тыпу Мінгарана.

...ИНСКАЯ ОБЛАСЦЬ АДСТАЕ ...А ЗБОЖЖАПАСТАЎКАХ

...інская область па збожжапастаўках ...мае адно з апошніх месц у рэспубліцы. ...20 жніўня план выканан да 16,7 ...ц. Лагойскі, Любаньскі, Бягомльскі, ...ські раёны области выканалі планы ...3 да 10 процантаў.

...сноўнай прычынай дрэннага выканання плана збожжапаставак з'яўляецца груб... нарушэнне пастановы ЦК ВКП(б) і ...СССР аб уборцы і загатоўках сельгаспаларчых прадуктаў. Калгасы імені ...яна, імені Тімірязева, «Энергія», Чэрвенскага раёна, раздалі калгасчікам каля ...тон зярна, не злаўшы дзяржаве ні аднаго пэнтнера. Каля 10 тон зярна незаконна раздалі калгаснікам кіраўнікі калгасаў імені Сталіна, «Перамога», «Барацьба» ...Крупскага раёна.

...нтызяржаўныя справы маюць месца ...агойскім раёне. Праўленне калгаса «Ізда» 20 пэнтнераў зярна першага ...лоту разбазарыла на розныя гаспатрэбы. У раёне ёсць нямала ...таў сабатажа малацьбы. У калгасе ...і Менжынскага малатарня прастаяла ...ш двух сутак толькі з-за гаю, што ...шыня калгаса не вылучыў людзей ...малацьбы.

...лікая колькасць збожжа затрымліцца на калгасных токах. У Копыльскім ...не абмалочана 23,7 проц. убранага ...жа. У многіх калгасах накапіліся ...яткі тон зярна, а да абавязковых паставак большасць калгасаў яшчэ не прыступіла. (БЕЛТА).

...ўба азімых на Палессі

...АЗЫР. На калгасных палях области ...ортваецца сяўба азімых. Масавая сяўпачалася ў Лельчыцкім раёне. З поўнагрузкай працуюць 18 радковых ...ак Лельчыцкай і Буйнавіцкай МТС. ...Петрыкаўскім раёне на 23 жніўня ...яна азімымі 300 гектараў. Калгас ...Мая» выканаў план сяўбы на 50 ...ц. На палі выехалі аграномы райземвідела і МТС. Яны аказваюць практычную дапамогу калгаснікам у іх барацьбе ...высокі ўраджай у будучым годзе.

...ле не ва ўсіх калгасах клапоцяцца аб ...ажі булучага года. Калгас імені Ільіча Камарынскага раёна, сяўбу азімых ...э нават не распачаў. 19 тон мінеральных угнаенняў ляжаць на станцыі. ...ьгасапель «Совецкая Беларусь» з 26 ...мінеральных угнаенняў вывезла толькі 2 тоны.

...7 Жыткавіцкім раёне сяўбу азімых пачалі 10 калгасаў. Астатнія нават не ...рыхтавалі насення. Не вывезена 561 ...а мінеральных угнаенняў.

...7 Брагінскім раёне ў многіх калгасах ...алі сеяць уручную. Радковыя-ж сеялкі не скарыстоўваюцца.

ВЫСОКАЎРАДЖАЙНАЯ КАРМАВАЯ КУЛЬТУРА

ГОМЕЛЬ. Калгасы імені Леніна і «Інтэрнацыянал», Гомельскага раёна, «Гудок» «Чырвоны будаўнік», Рагачоўскага раёнаў упершыню ў Беларусі пачалі разводзіць ...ую кармавую культуру — байзу. ...за расце на далёкім Усходзе. На сваіх ...сцях яна не ўступае канюшыне, а па ...алжайнасці зялёнай масы перавышае ...ў 4—5 разоў. Зярно байзы з'яўляецца ...рым кормам для хатняй птушкі.

Над пытаннямі развядзення байзы ў ...арусі па даручэнню СНК БССР працуе ...адчык кафедрай батанікі Горацкага ...льскагаспадарчага інстытута прафесар ...Ф. Нікалаеў. Гэтымі днямі тав. Нікалаеў наведаў калгасы, разводзячыя байзу. ...заявіў, што вопыты паказваюць магчымасць уняўрэння байзы ва ўсіх калгасах рэспублікі. Масавае разведзенне гэтай культуры дасць магчымасць значна ...ашаваць кармавую базу для растучай ...ыялістычнай жывёлагадоўлі.

ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ БУЛЬБЫ

ЖЛОБІН. На палях калгасаў раёна ...спе багаты ўраджай бульбы. У сельскагаспадарчай артэлі «Яскравы шлях» з ...жнага гектара пасеваў калгаснікі збіраюць па 1200—1500 пудоў ранняй ...льбы.

Калгасы раёна ўжо здалі дзяржаве ...ыш 200 тон бульбы. 250 тон бульбы ...гружаецца працоўным Комі АССР. (БЕЛТА).

БРАК—БІЧ ВЫТВОРЧАСЦІ

Палача стала па супорту дасягае 23—26 мм. замест патрэбных 40 мм. Абмежавальны вінт холу стала ўкарочан на 5 мм. Шліцы ўпорных шпілек не ачышчаны ад завусенцаў.

Гэтыя дэфекты выяўлены ў некалькіх абдзірачных станках тыпу «375-5» адзелам тэхнічнага кантролю (начальнік адзела тэхнічнага кантролю інжынер тав. Афонькін) віцебскага станкабудаўнічага завода імені Кірава.

Напрашваецца пытанне: чым аб'яснім, што поўнасцю сабраныя станкі, якія павінны толькі прайсці канчатковую прыёмку, маюць у сабе такія даволі буйныя дэфекты і адхіленні ад чарцяжоў?

Аб'ясняецца гэта тым, што на заводзе яшчэ не палнята са ўсёй вастрынёй пытанне аб барацьбе з унутрызаводскім бракам. А апошні яшчэ вельмі вялікі, асабліва ў ліцейным цэху (начальнік цэха тав. Немчанка). Тут брак даходзіць да 15—20 проц. замест дапускаемых планам 9 проц. У распаражэнні АТК ёсць 313 актаў, у якіх зафіксіраван выпуск бракаваных дэталей за ліпень месяц, з іх 235 актаў або 75 проц. прышадае на ліцейны цэх. Вельмі многа дэталей маюць газавыя і іншыя ракавіны, перакосы, шчыліны пасля заваркі і рад іншых дэфектаў.

Многа бракаваных дэталей выпускае і механічны цэх (начальнік цэха інжынер тав. Рохлін). Ператочка, перашліфоўка, выхад з межаў допуску — усё гэта яшчэ мае месца на радзе вытворчых працэсаў. Значна лепш абстаіць справа ў загатоўчым і зборачным цэхах, але і тут унутрыцэхавы брак яшчэ таксама канчаткова не ліквідаван. У загатоўчым цэху, напрыклад, яшчэ ёсць выпадкі няправільнай пакоўкі і тэрмаапрацоўкі.

У выпуску бракаваных дэталей вялікая віна начальнікаў цэхаў і майстроў участкаў. У пагоні за колькасным выкананнем плана яны часта не звяртаюць увагі на якасць зробленай дэталі.

Трэба адзначыць і яшчэ адну важную акалічнасць: выяўляемыя брак і іншыя дэфекты ў дэталях і станках не становяцца вядомымі ўсім рабочым. Аб іх толькі ведаюць работнікі адзела тэхнічнага кантролю і дырэкцыі. Вытворчыя нарады правозіцца рэдка. Супроць бракаробаў не ўзнята грамадская думка, рабочым мала гаворыць аб прычынах, параджаючых брак і аб мерах яго знішчэння.

Заводскія і цэхавыя арганізацыі выпрацавалі рад далатковых арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі, але, на жаль, іх вельмі павольна рэалізуюць. Не праводзіцца храміраванне рэчу дэталей (махавічкоў, рукаятак і інш.). Не закончана кампрэсарная ўстаноўка і не ўстаноўлен падвесны нажлачны камень. Хімічная лабараторыя не ўкамплектавана кваліфікаванымі работнікамі. Адсутнічае рад прыстасаванняў, прадугледжаных тэхналогіяй, у прыватнасці, па заточнаму станку тыпу «362-В». Нехапае калібраў, шаблонаў, скобаў, амаль зусім адсутнічаюць рэзьбавыя калібры і прыборы для вымярэння конуснасці. Вымяральная лабараторыя таксама не арганізавана.

Не перабудаваў як належыць сваю работу і тэхнічны адзел завода. Ёсць многа выпадкаў нясвоечасовага афармлення чарцяжоў, разыходжання размераў і т. д. Ёсць і такія факты, калі ў чарцяжах змяняюць размеры, а калібры і шаблоны пакідаюць старыя.

Усё гэта адмоўна адбіваецца на рабоце цэхаў і участкаў, параджае неахайнасць і недаклапатнасць у вырабе і апрацоўцы дэталей. Нізкаякасныя і бракаваныя дэталі прасочваюцца на зборку, гэе таксама ёсць рад вытворчых непаладкаў. У рэзультаце, у гатовых сабраных станках пры канчатковай праверцы выяўляюцца дэфекты і адхіленні ад тэхнічных умоў.

Ад такой работы церпіць выкананне плана не толькі па якасці, але і па колькасці прадукцыі. Ліпеньскі план па заводу выкананы толькі на 80 проц. З-за няўмелай арганізацыі працы, шматлікіх вытворчых непаладкаў на радзе ўчасткаў рабочыя прастойваюць цэлымі гадзінамі, перапыняльна і непрадукцыйна скарыстоўваюць свой рабочы дзень.

Змагацца за комплектны выпуск высокаякасных станкоў — гэта значыць у першую чаргу правільна арганізаваць увесь тэхналагічны працэс работы, строга сачыць за вырабам і апрацоўкай кожнай дэталі, рашуча змагацца з унутрызаводскім бракам.

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»).

З. ЛАРЫСАЎ.

У пракуратуры Сталінскага раёна Мінска

Пракуратурай Сталінскага раёна горада Мінска прыцягнуты да крымінальнай адказнасці бухгалтар скурзавода «Большэвік» Лях і рабочы гэтага-ж завода А. Гарахавік, якія займаліся раскраданнем сацыялістычнай маёмасці.

20 жніўня Лях украў з 2-га хромавага цэха адну хромавую скуру, але пры выхадзе з тэрыторыі завода быў затрыман дзяжурным кантрольнага паста. 21 жніўня ў прахадной кантрольнага паста быў затрыман А. Гарахавік. У яго былі выяўлены захаваныя пад піджакам украдзеныя дзве скуры.

Апрача таго, прыцягваецца да крымінальнай адказнасці рад асоб за хуліганства ў грамадскіх месцах і на прадпрыемствах горада. Л. П. Лысаў 17 жніўня збіў рабочага М. С. Янкелевіча, В. К. Прус 18 жніўня ў табачным магазіне па Ленінскай вуліцы наладзіў дэбош і нанёс удары гр-ну Юхімовічу. М. К. Пепік (без пэўных заняткаў і месцажыхарства), 16 жніўня штурхаў прахожых па Ленінскай вуліцы. Пры затрыманні, ён аказаў супраціўленне і нанёс пабоі паставому міліцыянеру Касцялепкаму і гр-ну Я. І. Дзянісаву. Д. В. Чытаеў 16 жніўня ў рэстаране «Еўропа» збіў швейцара.

Усе гэтыя хуліганы арыштаваны і хутка прадстануць перад судом.



На прадпрыемствах заходніх абласцей рэспублікі ідзе інтэнсіўная работа па пераабсталяванню старых і далабсталявання новых цэхаў. На здымку: у пераабсталяваным сельфактарным цэху 2-га Беластоцкага тэкстыльнага камбіната.

Фото А. Сапіра. (Фотахроніка БЕЛТА).

Замест агляду друку.

БОЛЬШ УВАГІ НІЗАВОМУ ДРУКУ

У друкарні імені Сталіна ў свой час выходзілі дзесяткі пэхавых і зменных штодзённых газет. Яны асвятлялі работу лепшых наборшчыкаў, лінатыпістаў, перапляцёчыц, карэктароў, накладчыц, перадавалі іх вопыт і заслужана бічавалі ўсіх тых, хто дрэнна працаваў, хто падрываў вытворчую дысцыпліну. Так было ў мінулым.

Якое-ж становішча зараз? Як нізавы друк вядзе барацьбу за ажыццяўленне гістарычных указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня, як ён мабілізуе калектыў на палянне прадукцыйнасці працы і якасць прадукцыі? Адказ на гэтыя пытанні кароткі: ніяк.

Рэдка ў якім пэху можна ўбачыць насценную газету. Дошкі, на якіх наклейваліся заметкі, ляжаць запыленыя пад шафай. Там-жа і архіў старых газет. Сакратар партарганізацыі тав. Гаўрылкевіч лічыў, што ў друкарні ёсць восем пэхавых насценных газет. Але калі ён з намі абышоў пэхі, то расчараваўся.

Комуністы і комсамольцы — рэдактары газет не памятаюць таго часу, калі яны адчуваліся за сваю работу перад партыйнай і комсамольскай арганізацыямі. Не ведаюць яны і такога выпадку, каб сакратар партарганізацыі пагаварыў з імі аб рабоце насценгазет. Не дзіўна пасля гэтага, што тав. Гаўрылкевіч не ведае рэдактароў, не ведае, што газеты выходзяць ад выпадку да выпадку.

Газета наборнага пэха «За большэвіцкую пільнасць», якую рэдагуе комуніст Табайнік, выпушчана звыш месяца назад. У перадавым артыкуле «За якасць» мы чытаем:

«З-за нядбайных адносін да чыткі зводкі «Меджурнала» № 3 і 4, за каз № 2239, стар. 49—64, па віне карэктара тав. Шэмпеля прапушчаны памылкі і прышлося перадрукаваць 8 старонак. Па віне зводчыцы Апаровіч былі пераблытаны малюнкі і прышлося перадрукаваць старонкі...»

Прыводзячы гэтыя факты, газета заклікала змагацца за якасць прадукцыі, за выкананне Ўказа ад 10 ліпеня. Але побач была змешчана заметка пад загалоўкам «Указ у дзеянні». У ёй гаварылася:

«У карэктарскім пэху... якасць прадукцыі за апошні час нядрэнная».

Як-жа так? У перадавым артыкуле карэктары фігуруюць як посыбіты браку, а ў заметцы сцвярджаецца, што якасць работы ў карэктарскім пэху «нядрэнная». Чаму-ж верыць?

Хіба так можна па-сапраўднаму змагацца за выкананне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб якасці прадукцыі?

У гэтым-жа нумары газеты не паказаны прагульшчыкі, дэзарганізатары вытворчасці, якіх нямала ў пэху, нічога не сказана аб выкананні Указа ад 26 чэрвеня.

У пераплётным пэху вісіць газета, прысвечаная выпуску Пазыкі трэцяй пяцігодкі. Аб выкананні Указа ад 26 чэрвеня тут ні слова. Але вось у адной заметцы — «Аб брыгадзірах» — гаворыцца:

«Тав. Гольдшміт-Лібо ў час работы часта стаіць і разгаварвае аб сваіх хатніх справах. Расказвае розныя байкі, а за гэты час у брыгадзе атрымліваецца брак, ідзе дрэнная заклейка, многа пераблытаных лістоў. У рэзультаце атрымліваецца перарасход».

Выявіўшы нарушэнне працоўнай дысцыпліны, якое вядзе да выпуску браку, газета не здолела палітычна ацаніць гэты факт і ліберальным тонам заявіла: «Патрэбна ўлічыць, што далей так працаваць нельга».

Роля нізавога друку ў ажыццяўленні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР велізарна. Ён абавязан выкрываць прагульшчыкаў, дэзарганізатараў вытворчасці і тых, хто хоць у малейшай ступені патурае ім. Нізавы друк, рабкоры павінны сістэматычна весці бязлітасную барацьбу за ўшчыльненне рабочага дня, за выпуск высокаякаснай прадукцыі. Яны павінны дапамагаць партарганізацыі ў барацьбе за выкананне пастаўленых перад прадпрыемствам задач.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН.

БІФШТЭКС і ЗАГАДЫ

У апошнія дні нас хвалююць такія навукова-даследчыя пытанні.

Першае. Якую суму трэба растраціць і якая колькасць прадуктаў павінна быць разбазарана, каб работнік меў права атрымаць пазыку па загаду?

Другое. Калі ў работніка выяўлены злоўжыванні, ці трэба яго аддаць пад суд, або, можа, лепш за ўсё пусціць яго ў волпуск і пасласць на курорт?

Трэцяе. Што павінен рабіць кіраўнік установы, скажам, трэста якога-небудзь,— кіраванць даверанай установай ці займацца літаратурнай творчасцю: пісаць мемуары, навелы, загады?

Указаныя навукова-даследчыя пытанні маюць прынцыповае значэнне, і мы не маем ніякага права абыйсці іх.

Чытач, напэўна, ужо здагадаўся, што гутарка будзе ісці аб стылі работы і кіраўніцтве дырэктара Мінскага трэста кафэ і рэстаранаў Меловага.

Слоў няма, Меловы кіруе даверанымяму ўчасткам. Але як?

Вядома, усяк можна ажыццяўляць канкрэтнае кіраўніцтва. Вось калі ўзяць дырэктара трэста кафэ і рэстаранаў. Што ён павінен рабіць?

Ён павінен забяспечыць:

каб у падведамственых трэсту прадпрыемствах грамадскага харчавання была ўзорная чыстата;

каб наведвальніка абслугоўвалі быстра, акуратна і культурна;

каб афіцыянткі не глядзелі на абедаючага, як на чалавека, які спецыяльна прышоў перашкаджаць ім у рабоце;

каб якасць блюд была на вышыні;

каб наведвальнік, вышаўшы з рэстарана, пакінуў аб сабе памяць не скаргай, а падзякай;

каб добрая слава хадзіла аб мінскіх сталовых і рэстаранах і аб іх кіраўніках.

Але калі ажыццяўляць такое кіраўніцтва — гэта-ж будзе трафарэт, ніякага палёту мысліі, ніякай выдумкі, ніякай навізны.

І Меловы рашыў: не, па гэтай пратаранай сцежцы яму не варта ісці. Трэба быць наватарам, так сказаць, Калумбам у пытаннях кіраўніцтва.

І ён стварыў свой метад кіраўніцтва. Ён пайшоў па шляху літаратурнай творчасці.

Ён пачаў пісаць, стварацъ шэдэўры мастацтва. Ён не пакідае свае мысліі ў валкім выглядзе, у чарнільніцы. Ён гэтыя мысліі пераносіць на паперу.

Галоўным і адзіным жанрам літаратурнай творчасці Меловы выбраў загады.

Трэба прама сказаць, у гэтым жанры ён дасягнуў такіх вышынь, што наўрад ці хто з нашых літаратараў з ім параўнаецца.

Пры мінскім рэстаране № 6 ёсць кафейная.

Кафейная мае загадчыка.

Прозвішча загадчыка — Оліна.

У кафейнай дапушчана псаванне булачак у колькасці 630 штук.

Дырэктар трэста Меловы піша загад за № 236. Як бачыце, не ў прыклад многім літаратарам, наш аматар прыгожай слаўнасці даволі пладавіты — 236 твораў за 7 месяцаў!

Загад напісан 22 ліпеня 1940 года. Вось змест гэтага твора.

«За сістэматычную нястачу прадуктаў; «за бесгаспадарчасць;

«за дапушчэнне псавання булачак у колькасці 630 штук — заг. кафейнай Оліну з работы зняць. Маючыяся нястачы спагнаць па суду. Матэрыял перадаць горпракурору для прыцягнення да крымінальнай адказнасці».

Але Оліна з работы не была знята.

Матэрыял у пракуратуру не перадан.

Чаму?

Вельмі проста. Загад-жа ёсць. А што яшчэ трэба?

Літаратурныя практыкаванні Меловага пралаўжаюцца. З-пад пяра дырэктара выходзяць наступныя поўныя высокага пафаса і логікі творы. —

3 жніўня гэтага года выдаецца загад за № 263. Можна толькі пазайздросціць такому быстраму напаўненню збору твораў Меловага. Тыдзень назад было 236 загадаў, а цяпер ужо 263! Ну, і пладавітасць-жа! Гэта вам нават не Опорэ дэ-Бальзак і не Лопе дэ-Вега.

Новы твор пачынаецца такімі радкамі:

«Загад па трэсту за № 236 ад 22 ліпеня гэтага года скасаваць».

Чаму-ж скасаваць? Можа ў кафейнай змянілася становішча? Быць можа, Оліна пасля зняцця з работы і аддачы пад суд пачала ўзорна працаваць?

Будзем чытаць далей. Паглядзім, што там напісана, у загадзе.

«За бесгаспадарчасць, якая выразілася ў сістэматычных недахопах па кафейнай;

«за адсутнасць належнага парадку ў абслугоўванні спажыўцоў;

«за няўменне кіраваць штатам — заг. кафейнай Оліну аслабаніць ад займаемай пасады».

Палічвае гэты загад хто-б вы думалі? Вядома, Меловы. Той самы Меловы.

Усякі разважлівы чалавек, які нават і не займае паста дырэктара трэста кафэ і рэстаранаў, можа задаць пытанне:

— Як-жа так? У першым загадзе Меловы знімае Оліну з работы і аддае пад суд, а другім загадам скасоўвае першы, прычым пералічвае ўсё тыя-ж матывы і ўжо не знімае з работы і не аддае пад суд Оліну, а толькі аслабляе яе ад займаемай пасады.

Але такое пытанне будзе зусім не к месцу. Таму што Меловы любіць такія літаратурныя практыкаванні. Яму падабаецца сама работа — выдаваць загады. Астатняе яго мала цікавіць. Важна, каб крывая выдання загадаў увесь час ішла ўверх. Такі ўжо ў яго стыль. Такі ў яго метад кіраўніцтва. Быў-бы загад... Няважна, што ў ім напісана. Астатняе прыкладзецца.

А што-ж з Олінай?

Перад намі новы загад, напісаны ўжо дырэктарам рэстарана № 6 Панцэвічам 14 жніўня гэтага года.

«Заг. кафейнай т. Олінай праставіць вопуск з 6 жніўня па 4 верасня 1940 года».

Гаворыць, што гэты загад таксама змянен.

Карацей кажучы, цяжка разабрацца, што і да чаго, калі людзі выбралі асноўным металам кіраўніцтва — выданне загадаў.

Меловы няўтомны ў сваіх літаратурных шуканнях. Яго канцылярска-бюракратычны стыль кіраўніцтва, шчыра кажучы, не зусім новы. Але ў навуку аб бюракратызме ён безумоўна ўнёс некаторы ўклад, за што, трэба меркаваць, удзячныя нашчадкі з горласпю будуць вымаўляць імя Меловага.

І калі ў бліжэйшы час будзе праведзен конкурс кіраўнікоў устаноў, якія прымяняюць толькі канцылярска-бюракратычны метад, Меловы безумоўна ўвойдзе ў прызавую пяцёрку.

С. КУНЯЎСКІ.

НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

ВЕГЕТАЦЫЙНЫ ДОМІК

Як навучыцца ўпраўляць жыццём ...слін? Дзе знайсці ключ, які дазволіў ...м пранікнуць у таямнічую лабараторыю ...рыроды, пазнаць найскладанейшыя працэсы, што адбываюцца ў раслінным арганізме, і не толькі пазнаць, але і аўладаць майстэрствам палпаратканання іх ...ля чалавека?

Інстытут фізіялогіі раслін Акадэміі навук СССР, узначальваемы акадэмікам ...Н. Бахам, у шырокіх маштабах робіць ...следы, якія маюць велізарнае значэнне ...я раскрыцця ўсіх гэтых праблем. Пы...анні ўпраўлення развіццём расліннага ...ргаізма шляхам светавога рэжыма, мінеральнага харчавання правільнага падбо...у культур у севаабароце, нам вырашэнем якіх працуе інстытут, прадстаўляюць вялікую цікавасць для практыкаўаследчыкаў, селекцыянераў, аграномаў і ...сёй многамільённай арміі калгаснікаў. ...дзел інстытута ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы з'яўляецца своеасаблівай творчай справаздачай совецкай ...фізіялогіі раслін перад калгаснай вёскай.

Інстытут дэманстрыруе свае работы не ...ў звычайных выставачных умовах: побач ...з павільёнам «Зярно» для гэтай мэты ...дабудаван шкляны вегетацыйны домік. У ...м — многія сотні падвопытных раслін, ...прывезеных з лабараторый і пяцілін інстытута. Вегетацыйны домік на выстаўцы значна адрозніваецца ад падобных ...дабудоў, створаўшыхся да рэволюцыі. Па ...ініцыятыве К. А. Тімірязева ў 1872 го...дзе быў пабудаван у Пятроўскай (цяпер Тімірязеўскай) с. г. акадэміі першы ў Расіі вегетацыйны домік. Тімірязевым-жа былі створаны і два наступныя домікі: ...адзін — на даху Маскоўскага універсітэта, а другі — на Ніжагародскай выстаўцы 1896 года.

Вегетацыйны домік, пабудаваны на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, невялікі, але ён у дзесяць раз больш за тых, якія калісьці былі створаны Тімірязевым. Падвопытныя расліны ўстаноўлены ў ім на ваганетках, якія выкатваюць па рэльсах на адкрытую пляцоўку.

Вегетацыйны домік па сутнасці — новы выставачны павільён. Ён запоўнен экспанатамі, якія прадстаўляюць вялікую цікавасць для ўсіх катэгорый наведвальнікаў. Перш за ўсё іх увагу прыцягваюць 40 аднолькавых шкляных сасудаў з празрыстай вадкасцю. З кожнага сасуда цягнецца ўверх сцябло кукурузы. Мала спакушаны наведвальнік даведваецца тут, што расліна можа развівацца і без глебы. Карнявая сістэма кукурузы знаходзіцца ў вадзе, а расліна тым не менш прадаўжае расці. Уся справа, значыць, у тым, каб стварыць для раслін неабходнае пажыўнае асяроддзе. Не трэба быць асабліва ўважлівым, каб выявіць розніцу ў раслінах, якія знаходзяцца ў розных шкляных сасудах. Вось два сасуды са звычайнымі раслінамі кукурузы. У вадзе, запаўняючай гэтыя сасуды, растворана солі ўсіх сямі неабходных для жыцця расліны мінеральных элементаў: азота, фосфара, калія, кальцыя, магнія, серы і жалеза. У вадзе наступнай пары сасудаў растворана ўсе вяшчэствы, апрача жалеза. Лёгка заўважыць, што адсутнасць жалеза рэзка адбілася на лістах: яны амаль страцілі свой зялёны колер, афарбаваны бледна. Два другія сасуды пазбаўлены магнія. На яго адсутнасць расліна рэагуе тым, што лісты робяцца нібы мраморнымі, ясна выступаюць пражылкі, паяўляюцца плямы.

Гэта — першыя назіранні, якія робіць наведвальнік вегетацыйнага доміка. У кожнага, натуральна, узнікае пытанне: ці нельга па афарбоўцы лістоў, стану сцябла і іншых відзімых прызнаках вызначыць у палявых умовах, якіх пажыўных вяшчэстваў нехапае ў глебе. Ужо даўно рабіліся спробы па знешняму выгляду высветліць патрэбнасць раслін ва ўгнаеннях, устанавіць, у якім іменна з элементаў мінеральнага харчавання расліна ў даным выпадку мае патрэбу. Далейшыя работы ў гэтым напрамку дадуць магчымасць знайсці дакладны спосаб быстрага распазнавання прычын недамагання раслін з-за адсутнасці ў глебе тых ці іншых харчовых вяшчэстваў. Аўладаўшы гэтым спосабам, можна будзе з найлепшымі рэзультатамі рэгуляваць харчаванне раслін.

Выразна выступае ў вопытах інстытута дзяленне раслін на дзве групы — доўтага і кароткага дня. З агляду падвопытных раслін у вегетацыйным доміку наведвальнікі даведваюцца, што на скорасць зацвітання вялікі ўплыў аказвае працягласць светлага і цёмнага перыяда сутак. Расліны доўтага дня (яравыя — пшаніца, авёс, ячмень і інш.) пачынаюць цвісці хутчэй, калі дзень даўжэй за ноч, а расліны кароткага дня (проса, соя, канопілі і многія іншыя), наадварот, — калі ноч даўжэй за дзень. З гэтых даследаў следуе практычны вывад: у падборы культур неабходна ўлічваць, апрача ўсіх іншых прызнакаў, яшчэ і чуткасць расліны на даўжыню дня і ночы. На жаль, у нас яшчэ няма поўных спісаў, у якіх-бы ўсе культурныя расліны падзяляліся па гэтаму прызнаку, але зараз інстытут папаўняе прабел, і ў хуткім часе аграномы атрымаюць гэта каштоўнейшае кіраўніцтва.

Вегетацыйны домік на выстаўцы дэманстрыруе наступныя доследы. У двух сасудах растуць хрызантэмы. Для адной расліны штучна створан кароткі дзень. Для гэтага яна 8—10 гадзін знаходзіцца на святле, затым пераносіцца ў цёмную камеру. Гэта расліна ўпрыгожана пышнымі махровымі кветкамі, тады як на другой расліне, якая знаходзіцца на святле 13—15 гадзін у суткі, кветак няма. Ясна: хрызантэма — расліна кароткага дня. Дзве малюсенькія дзялянкі заняты каноплямі. На абодвух дзялянках расліны знаходзяцца ў аднолькавых умовах харчавання, але ў адну з іх унесен азотабактэрын. Расліны на гэтай дзялянцы гусцейшыя, спяблы і лісты мацнейшыя. Азотабактэрын, як устаноўлена даследным шляхам, здолен павялічыць ураджайнасць канапель на 80—90 проц.

Дэвізам вегетацыйнага доміка, вызначаючым увесь яго змест, маглі-б стаць бяссмертныя словы К. А. Тімірязева: «...што-ж патрэбна для забеспячэння ўраджаю? Перш за ўсё, зразумела, знаёмства з патрэбнасцямі расліны і ўменне ім задаволіць, а затым ужо—адшукванне найбольш выгадных умоў вырашэння гэтай задачы пры дапамозе сродкаў, якія ёсць пад рукой».

Совецкая навука ў неразрыўным саюзе з перадавой стаханаўскай практыкай сацыялістычнага земляробства імкнецца аўладаць майстэрствам упраўлення жыццём раслін. Зроблена ў гэтым напрамку многа, але яшчэ больш прадстаіць зрабіць. Усё глыбей пранікаючы ў лабараторыю прыроды, крок за крокам павышаючы пладароднасць зямлі, мы зможам у найкаранейшы тэрмін зрабіць усе нашы калгасы і соўгасы гаспаладаркамі высокіх сапраўды сталінскіх ураджаяў.

Вегетацыйны домік на выстаўцы наглядна сведчыць, што сацыялістычнае земляробства мае неабмежаваныя магчымасці для стварэння ў краіне нябачанага дастатку сельскагаспадарчых прадуктаў.

А. ШЧЭРБАКОЎ,
нам. дырэктара Інстытута фізіялогіі раслін Акадэміі навук СССР.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ АРГАНІЗАВАЦЬ ЗБОЖЖАПАСТАЎКІ

Многія калгасы нашай рэспублікі адначасова з уборкай і малацьбой прыступілі да здачы зярна. Прыкладам можа служыць калгас «Комінтэрн», Харлапаўскага сельсовета, Кіраўскага раёна. Калгас поўнасцю і датэрмінова выканаў свае абавязацельствы перад дзяржавай па здачы сена, зярна і гародніны. Калгасы гэтага-ж раёна: «Пролетарская перамога» Грабнецкага сельсовета, «Трэці з'езд совецкаў», Казуліцкага сельсовета, імені Сталіна Любоніцкага сельсовета, выканалі свае абавязацельствы па здачы зярна дзяржаве.

Аднак у некаторых раёнах здача збожжа арганізавана зусім нездагальняюча, карушаецца пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб уборцы і загатоўках сельгаспрадуктаў.

15 калгасаў Дубровенскага раёна, Віцебскай области,—«13 год Кастрычніка», «Чырвоны сход», «VII з'езд Совецкаў», «Гігант», імені Варашылава і інш. — змалолі зярно першага абмалоту і раздалі калгаснікам, а да здачы зярна дзяржаве не прыступілі.

У калгасе «Чырвонае Турава», Сідзюрненскага сельсовета, Сенненскага раёна, не прыступіўшы да выканання абавязацельстваў перад дзяржавай, раздалі калгаснікам 2.000 кілограмаў зярна. Тое-ж самае зрабілі ў калгасе імені Будзённага, Мыпішчанскага сельсовета, гэтага-ж раёна. Тут размеркавалі паміж калгаснікамі значную колькасць жыта, забыўшы аб абавязацельствах па хлебапастаўках. Старшыня калгаса імені Варашылава, Сенненскага раёна, прадаў у Віцебску на рынку бульбы на 1.800 рублёў, хоць здачу бульбы дзяржаве калгас і не пачынаў.

Не мала падобных фактаў антыдзяржаўных дзеянняў у калгасах «Чырвоная Украіна», Горнскага сельсовета, Камарынскага раёна, у калгасе «Здвіг», Лельчыцкага раёна, у калгасах Чэрыкаўскага, Крычаўскага, Жлобінскага і Церахоўскага раёнаў.

Такое становішча з'яўляецца рэзультатам адсутнасці сапраўды большэвіцкай барацьбы за выкананне плана зернапаставак, недапушчальнай бяскопатнасці кіраўнікоў указаных раёнаў. Невыпадкова па 15 жніўня план хлебапаставак выканан па Віцебскай области толькі на 7,5 проц., тады як у 1939 годзе па гэты час план быў выканан на 12,3 проц. Па Мінскай области план выканан на 7,5 проц. супроць 13,3 проц. у мінулым годзе.

Некаторыя кіраўнікі раённых арганізацый не толькі не клапоцяцца аб выкананні плана зернапаставак, але дапускаюць прамую антыдзяржаўную практыку. Жыткавіцкі райвыканком, напрыклад, прыняў рашэнне прасіць Соўнарком БССР замяніць натураплату за работу МТС грашовай платай. Пракурор Мазырскага раёна тав. Агееў алмовіўся ад прыцягнення да адказнасці старшыні калгаса імені Калініна Бабруйскага, які раздаў зярно калгаснікам па працадні, а да здачы зярна дзяржаве не прыступіў. Кіраўнікі раёна, ведаючы аб гэтым, не прынялі канкрэтных мер да таго, каб старшыня калгаса быў пакаран.

Партыйныя, совецкія і загатоўчыя органы ў радзе месц не ўлічылі ўрокаў мінулага года, калі многія адпаасобныя гаспадаркі не выконвалі свае абавязацельствы перад дзяржавай. У бягучай загатоўчай кампаніі ўжо наглядаецца паўтарэнне такога становішча. Адпаасобнікі Барысаўскага, Рэчыцкага, Чэрвеньскага, Жлобінскага, Быхаўскага і Суражскага раёнаў па сутнасці яшчэ не прыступілі да здачы зярна дзяржаве па ўручаных ім абавязацельствах.

Многія калгасы заходніх абласцей паказваюць узоры большэвіцкага энтузіязма ў здачы зярна дзяржаве.

Гадавы план зернапаставак калгасамі заходніх абласцей выканан ужо больш чым на 45 проц. Калгаснікі заканчваюць здачу зярна дзяржаве. Адпаасобныя сялянскія гаспадаркі таксама выконваюць свае абавязацельствы.

Кулацка-заможная-ж частка вёскі ў заходніх абласцях прабуе ўсімі мерамі сарваць загатоўку зярна. Ёсць рад фактаў утойвання ворыўнай зямлі ад абкладання, дастаўкі на прыёмныя пункты дрэннага зярна.

Кіраўнікі мясцовых партыйных, совецкіх і загатоўчых арганізацый усіх абласцей БССР павінны ўстанавіць штодзённы нагляд і кантроль за ходам загатовак з тым, каб забяспечыць выкананне плана ва ўстаноўленыя тэрміны, быстра і культурна прыняць зярно ад здатчыкаў.

Ф. ЛЕЛЬЧУК.
Намеснік Упаўнаркамзага СССР па БССР.

Смерць міжнароднага шпіёна

Тэлеграф прынёс вестку аб смерці Троцкага. Як паведамляюць амерыканскія газеты, на Троцкага, пражываўшага апошнія годы ў Мексіцы, быў зроблен замах. Рабіўшы замах — Жак Мортан Вандэндрайш—адзін з бліжэйшых людзей і паслядоўцаў Троцкага.

У магілу сышоў чалавек, чыё імя з пагардай і праклёнам вымаўляюць працоўныя ва ўсім свеце, чалавек, які на працягу многіх год змагаўся супроць справы рабочага класа і яго авангарда—большэвіцкай партыі. Пануючыя класы капіталістычных краін страцілі вернага свайго слугу. Замежныя разведкі страцілі доўгалетняга, мацёрага агента, арганізатара забойцаў, які не тідзіўся ніякімі сродкамі для дасягнення сваіх контрэволюцыйных мэт.

Троцкі прайшоў доўгі шлях прадажніцтва і здрады, палітычнага двурушніцтва і крывадушнасці. Недарма Ленін яшчэ ў 1911 годзе ахрысціў Троцкага клічкай «Іудушка». І гэта заслужаная клічка назаўсёды асталася за Троцкім.

Троцкі пачаў сваю палітычную дзейнасць як меншавік-антырэволюцыянер. Ужо ў 1903 годзе, на другім з'ездзе РСДРП ён ярасна выступае супроць Леніна, алстойваючы і падтрымліваючы погляды Мартава і іншых антырэволюцыйных меншавіцкіх лідэраў. Незадоўга да пачатку руска-японскай вайны Троцкі яшчэ больш адкрыта паказвае свой твар адступніка і антырэволюцыянера. Ён скатваецца на пазіцыі махровага абарончаства, гэта значыцца абароны «бацькаўшчыны» цара, памешчыкаў і капіталістаў.

Рэволюцыю 1905 года Троцкі сустрэў праславутай тэорыяй «перманентнай» рэволюцыі. Гэта была тэорыя разбурэння пролетарыята, дэмабілізацыі яго сіл. Пасля паражэння рэволюцыі 1905 года Троцкі падтрымлівае меншавікоў-ліквідатараў. Уладзімір Ільіч Ленін так пісаў тады аб Троцкім:

«Троцкі павёў сябе, як самы подлы кар'ерыст і фракцыянер... Балбоча аб партыі, а трымае сябе горш за ўсіх іншых фракцыянераў».

Троцкі з'явіўся, як вялома, арганізатарам аўгустоўскага антырэволюцыйнага меншавіцкага блока ўсіх груп і плыняў, выступаўшых супроць Леніна.

Пачаўшуюся ў жніўні 1914 года імперыялістычную вайну Троцкі сустрэў, як і трэба было чакаць, на тым баку барыкад — у стане абаронцаў імперыялістычнай бойні. Ён прыкрываў сваю здраду пролетарыяту «левымі» фразамі аб барацьбе з вайной, фразамі, разлічанымі на ашуканства рабочага класа. Па ўсіх важнейшых пытаннях вайны і сацыялізма Троцкі выступаў супроць Леніна, супроць большэвіцкай партыі.

Усё ўзрастаючую сілу ўплыву большэвікоў на рабочы клас, на салдацкія масы пасля лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі, агромную папулярнасць лозунгаў Леніна ў народных масах меншавік Троцкі распаніў па-свойму. Ён уступіў у нашу партыю ў ліпені 1917 года разам з групай сваіх старонніка ў, заявіўшы, што ён «раззброіўся» да канца.

Наступныя падзеі паказалі, аднак, што меншавік Троцкі не раззброіўся, ні на мінуту не спыніў барацьбы супроць Леніна і ўвайшоў у нашу партыю для таго, каб узарваць яе знутры.

Ужо праз некалькі месяцаў пасля Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі вясной 1918 года Троцкі разам з групай так званых «левых» комуністаў і левых эсэраў арганізуе злодзейскую змову супроць Леніна, імкнучыся арыштаваць і фізічна знішчыць правадыроў пролетарыята Леніна, Сталіна і Свердлова. Як і заўсёды, сам Троцкі — правакатар, арганізатар забойцаў, інтрыган і авантурыст—астаецца ў ценю. Яго кіруючая роля ў падрыхтоўцы гэтага злачынства, якое на шчасце не ўдалося, поўнасцю ўскрываецца толькі праз два дзесяцігоддзі на працесе антысовецкага «права-трацкісцкага блока» ў сакавіку 1938 года. Толькі праз дваццаць год брудны клубок злачынстваў Троцкага і яго прыхлябацеляў быў канчаткова разблытан.

У годы грамадзянскай вайны, калі краіна Советаў адбівала націск шматлікіх полчышч белагвардзейцаў і інтэрвентаў, Троцкі сваімі здрадніцкімі дзеяннямі і шкодніцкімі загадамі ўсякімі сродкамі паслабляў сілу супраціўлення Чырвонай Арміі, з прычыны чаго яму было забаронена Леніным наведваць Усходні і Паўднёвы фронты. Агульнавядомы факт, калі Троцкі, у сілу сваіх варожых адносін да старых большэвіцкіх кадраў, прабаваў расстраляць цэлы рад непрыемных яму адказных комуністаў-франтавікоў, дзейнічаючы гэтым на-руку ворагу.

На тым-жа працэсе антысовецкага «права-трацкісцкага блока» быў перад усім светам ускрыт увесь прадажніцкі, здрадніцкі шлях Троцкага: падсудныя на гэтым працэсе, бліжэйшыя супольнікі Троцкага, прызналіся, што і яны і разам з імі і іх шэф Троцкі **ўжо з 1921 года былі агентамі замежных разведак, былі міжнароднымі шпіёнамі.** Яны на чале з Троцкім рэўнасна служылі разведкам і генеральным штабам Антліі, Францыі, Германіі, Японіі.

Калі ў 1929 годзе совецкі ўрад высылаў з межаў нашай радзімы контррэволюцыянера, здрадніка Троцкага, — капіталістычныя круті Еўропы і Амерыкі прынялі яго ў свае абдымкі. Гэта было не выпадкова. Гэта было заканамерна. Бо Троцкі ўжо даўным-даўно перайшоў на службу эксплаататарам рабочага класа.

Троцкі запутаўся ў сваіх уласных сецях, дайшоўшы да мяжы чалавечага падзення. Яго забілі яго-ж староннікі. З ім пакончылі тыя самыя тэрарысты, якіх ён вучыў забойству з-за вугла, здрадніцтву і злачынствам супроць рабочага класа, супроць краіны Советаў. Троцкі, які арганізаваў злодзейскае забойства Кірава, Куйбышэва, М. Горкага, стаў афярай сваіх-жа ўласных інтрыг, прадажніцтваў, здрад, злачынстваў.

Так бясслаўна кончыў сваё жыццё гэты агідны чалавек, сышоўшы ў магілу з пячаццю міжнароднага шпіёна і забойцы на чале. («Правда»).

СМЕРЦЬ ТРОЦКАГА

ЛОНДАН, 22 жніўня. (ТАСС). Лондонскае радыё сёння паведаміла:

У Мексіцы ў больніцы памёр Троцкі ад пралому чэрапа, атрыманага ў час замаху на яго адной з асоб яго бліжэйшага акружэння.

Японія і ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 24 жніўня. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што выконваючы абавязкі дзяржаўнага сакратара ЗША Уэлес каля двух тыдняў назад запрасіў японскага пасла Харынаўцы і падрабязна вылажыў пазіцыю ЗША ў адносінах Далёкага Усхода і ўручыў яму агляд японска-амерыканскіх адносін за перыяд з ліпеня 1937 года. У агляднзе ўпамінаецца аб парушэннях праў ЗША ў Кітаі. У заключэнне ўказваецца, што гэтыя дзеянні японскага ўрада не могуць быць забыты і што павінен прыйсці час расплаты. Сцвярджаюць, што дакумент складзен у вельмі рэзкіх выразах і з'яўляецца адным з самых энергічных прадстаўленняў, якія рабіліся Злучанымі Штатамі Японіі на працягу апошніх трох год. Перадаюць, што Харынаўцы пераслаў дакумент міністру замежных спраў Мацуока, які яшчэ не даў адказу, а магчыма і не дасць.

У дапамогу чытачу

„Вярблюжы корпус“

Афрыканскі тэатр ваенных дзеянняў характарызуецца наяўнасцю вялікіх пустынных прастораў. Амаль поўная адсутнасць вады і расліннасці робяць магчымым жыццё чалавека толькі ў рэдка сустракаючыхся аазісах і ля крыніц вады. Паверхня пустыні пакрыта сыпучымі пяскамі, пад уплывам ветру яны ўтвараюць пясчаныя ўзгоркі — «барханы», дасягаючыя 20 метраў у вышыню. Прасоўванне па сыпучых пясках надзвычайна цяжкае, ваду можна дастаць толькі ў калодзежах глыбінёй у 60—100 метраў, прычым вады звычайна вельмі мала, яна горка-салёная па смак і часта непрыгодная ні для піцця, ні для матораў.

Ва ўмовах моцнай жары, бязводдзя і сыпучых пяскоў сучасная ваенная тэхніка — танкі, бронеаўтамабілі, аўтатранспарт сустракаюцца з вялікімі цяжкасцямі, тады як вярблюд з поспехам можа быць скарыстан у вялікіх пераходах для выканання баявых задач. Вярблюд можа несці на сабе наезніка, чатырохдзённы запас вады, харчаванне, асабістыя рэчы наезніка, васьмідзённы запас зярна для сябе і 210 патронаў. Агульная вага ўюка разам з наезнікам—160 кілограмаў. Вярблюд не пераборлівы ў харчах, можа піць горка-салёную ваду, якая сустракаецца ў калодзежах, вырытых у пустыні.

Вярблюжыя часці ёсць у каланіяльных арміях Францыі, Англіі і Італіі. Італія, якая прымяняла ў часе вайны з Абісініяй у велізарных размерах сучасную ваенную тэхніку, вымушана была прымяняць у некаторых напрамках таксама і вярблюжыя часці.

Каланіяльныя англійскія вярблюжыя часці называюцца «вярблюжымі карпусамі». Яны ёсць у Англа-Егіпецкім Судане, адзін вярблюжы корпус знаходзіўся ў Брытанскім Самалі.

Англійскі вярблюжы корпус складаецца ўсяго з 8 рот, з іх 6 рот перасоўваюцца на вярблюдах, адна рота так званай «ездзячай пяхоты» перасоўваецца на мулах і адна рота аўтатранспартная. У вярблюжым корпусе, без аўтатранспартнай роты, налічваецца каля 900 чалавек. На ўзбраенне корпуса, апрача вінтовак, знаходзіцца 14 кулямётаў, артылерыі корпус не мае. Характар баявога скарыстання вярблюжага корпуса залежыць ад таго, з якім праціўнікам прыходзіцца весці бой. У вайне з Італіяй, прымяняючай у вялікіх маштабах сучасную ваенную тэхніку, вярблюжыя карпусы могуць скарыстоўвацца толькі для разведкі і аховы рухомай абароны. Ва ўзаемадзеянні з авіяцыяй і ў адпаведнасці з агульным планам ваенных дзеянняў на тэатры вайны вярблюжыя карпусы могуць быць скарыстаны для рэйдаў у тыл праціўніка з самымі разнастайнымі задачамі: разведка праціўніка, знішчэнне яго жывой сілы, матэрыяльнай часткі, харчовых і водных баз, разбурэнне аэрадромаў, вузлоў сувязі, захват аазісаў, арганізацыя паўстанняў у тылу праціўніка.

Вярблюжы корпус, які дзейнічаў у Брытанскім Самалі, не мог, вядома, пры сваёй нязначнай агнявой магутнасці аказаць сур'ёзнага супраціўлення наступаючым італьянскім калонам. Ён мог толькі выканаць адну задачу — метадам рухомай абароны замарудзіць прасоўванне італьянскіх калон і тым самым даць магчымасць паспяхова закончыць эвакуацыю Бербера па прыкладу Дзюнкерка, пасля чаго яму прышлося скласці зброю.

Палкоўнік Н. АНДРЭЕЎ.

У доме былога ўладальніка Нёманскага шклозавода (Баранавіцкая вобласць) адкрыта больніца на 40 месц.
Фото Е. Халдзя. (Фотахроніка БЕЛТА).

НАСУСТРАЧ ВЯЛІКАМУ СВЯТУ

БРЭСТ. Працоўныя вобласці дзейна рыхтуюцца да ўсенароднага свята—гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны з-пад ярма польскіх паноў.

На прадпрыемствах, ва ўстановах, у калгасах і вёсках — усюды праходзяць сходы, на якіх абмяркоўваецца пытанне аб падрыхтоўцы да знамянальнай даты. Працоўныя бяруць абавязацельствы сустрэць 17 верасня новымі вытворчымі перамогамі. Падрыхтоўку да свята многія калгасы адзначаюць поўным выкананнем зернепаставак дзяржаве. Калгасы «Парыжская комуна» і «Перамога», Высакоўскага раёна, поўнасцю разлічыліся з дзяржавай і першымі пачалі сяўбу азімых. На сваіх сходах сяляне Вярховіцкага, Баршчэўскага, Велчынскага і інш. сельсаветаў узялі абавязацельствы 17 верасня сустрэць поўным выкананнем зернепаставак і ўсіх плацяжоў.

СНАЙПЕРЫ

Гомельская снайперская школа Асоавіяхіма выпусціла 44 снайперы. 19 з іх атрымалі адзнакі «выдатна» і 25 — «добра». Усе выпускнікі атрымалі званне снайпера Асоавіяхіма і інструктара стралковага спорта 3-й катэгорыі па падрыхтоўцы варашылаўскіх стралкоў першай ступені па новай комплексній праграме. Асабліва добрыя рэзультаты ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы паказаў узвод т. Румянцава. Тав. Румянцаў прэміраван гарадскім советам Асоавіяхіма. («Гомельская праўда»).

УСЕСАЮЗНЫЯ РЭКОРДЫ ПА ПЛАВАННЮ

На водная станцыі спартыўнага таварыства «Воднік» (Гомель) праходзяць усебеларускія спаборніцтвы па плаванню. Удзельнічаюць 91 мацнейшы плавец Мінска, Гомеля, Магілева, Віцебска, Беластока, Баранавіч і Пінска.

За два дні спаборніцтваў устаноўлена пяць новых усебеларускіх рэкордаў па плаванню, з іх 2 усесаюзныя.

НОВЫЯ СТУДЭНТЫ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА

Закончыліся конкурсныя прыёмныя іспыты ў Беларускім дзяржаўным універсітэце—старэйшай вышэйшай навучальнай установе рэспублікі, адзначаючай хутка сваё 20-годдзе. На 300 вакантных месц было падана 540 заяў. Асабліва вялікая цяга на фізіка-матэматычны факультэт, дзе на 20 выкантных месц іспыты трымалі 70 чалавек. Гэта дало магчымасць адабраць ва універсітэт самых здольных, найбольш падрыхтаваных.

У ліку новых студэнтаў—96 выдатнікаў сярэдніх школ. Гэта дзеці калгаснікаў, рабочых, працоўнай інтэлігенцыі з Мінскага, Полацкага, Магілеўскага, Тураўскага і інш. раёнаў і гарадоў БССР. Асабліва добра падрыхтаваную моладзь далі школы №№ 2, 4, 5, 9, г. Мінска і школы Гомеля і Барысава.

Сярод новых студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта ёсць жыхары Кіева, Смаленска, Камчаткі.

У новым навучальным годзе на фізіка-матэматычным, геаграфічным, філалагічным, хімічным, гістарычным і біялагічным факультэтах будуць займацца 1.500 чал. Выкладчыцкі калектыў налічвае 150 чал., у тым ліку 19 прафесароў і доктараў навук. Сярод выкладчыкаў—акадэмікі Нікольскі, Перцаў, Годнеў, Ліпатаў. У аспірантуру па кафедрах гісторыі партыі, хіміі, біялогіі і інш. набіраецца 19 чалавек.

Універсітэцкая бібліятэка, налічваючая больш 150 тысяч тамоў, папоўнілася літаратурай і падручнікамі. Адкрыта новая бібліятэка для навуковых работнікаў. Ёсць заалагічны, гістарычны і геалагічны музеі. Шматлікія лабараторыі атрымалі да надыходзячага навучальнага года новае першакласнае абсталяванне—розныя прыборы і апаратуру, на што выдаткавана 200 тыс. рублёў.

Выпуск у інстытуце фізкультуры

Гэта было чатыры годы назад. З пакоя прыёмнай камісіі выбег са ззяючым, расчырванеўшым тварам малады чалавек. Прыяцелі адразу абступілі яго.

— Ну як, Аркадзій?

— Гавары хутчэй, прынят?

Аркадзій Аляксеевіч Шэйбак не мог прыйсці ў сябе ад радасці. Даўнейшая мара яго збылася: ён стаў студэнтам інстытута фізкультуры.

Цяга да фізкультуры і спорта ў моладзі велізарная. У інстытуце займаецца 250 юнакоў і дзяўчат. Усе яны ўпорна і настойліва вывучаюць фізкультурную справу, рыхтуючыся стаць кіруючымі фізкультурнымі работнікамі.

...У пакой, дзе працуе камісія па размеркаванню скончыўшых інстытут, адзін за адным уваходзяць выпускнікі. Камісія добра ведае кожнага. Ёй вядома і акадэмічная паспяховасць, і грамадскі твар, станоўчыя і адмоўныя якасці выпускніка.

У гэтым годзе Беларускі дзяржаўны інстытут фізкультуры заканчваюць 46 чалавек. Усе выпускнікі — значкісты ГПА 2-й ступені. 70 процантаў — комсамольцы. Праведзеныя дзяржаўныя іспыты паказалі высокі ўзровень палітычнай падрыхтоўкі выпускнікоў. Больш 50 проц. здалі дзяржаўныя экзамены на выдатна і добра.

Сярод выдатнікаў—лепшы спартсмен — Аркадзій Аляксеевіч Шэйбак, выдатны гімнаст, Андрэй Дзмітравіч Ханенка, Аляксандра Георгіеўна Марозава, Марыя Міроная Мысько, вядомы ў рэспубліцы гіравік у цяжкай вазе — Андрэй Карнеевіч Самусевіч і іншыя.

Хутка добра падрыхтаваны тэарэтычна і практычна малады атрад работнікаў фізкультуры выедзе па работу ў раёны Усходніх і Заходніх абласцей БССР.

І. МІН.

Паветраныя вучэнні груп самаабароны

З 22 жніўня ў Мінску пачаліся паверачныя вучэнні груп самаабароны, у якіх удзельнічаюць домаўпраўленні, прадпрыемствы і ўстановы. У праграме—праверка гатоўнасці ўсяго аб'екта да светамаскіроўкі, работа групы самаабароны па ліквідацыі ачага паражэння — тушэнне пажару, дэгазацыя атручанай мясцовасці і аказанне першай дапамогі пацярпеўшым ад хімічнага нападу.

За першыя два дні вучэнні адбыліся ў 13 групах самаабароны. Добрую ацэнку атрымалі ад пасрэднікаў групы самаабароны чулочна-трыкатажнай арцелі імені Крупскай, завода малочных кіслот, домаўпраўленняў №№ 150, 160, 162 і інш.

Паверачныя вучэнні працягнуцца да 31 жніўня. У першыя дні верасня такія-ж вучэнні будуць праведзены ў навучальных установах горада. (БЕЛТА).

ПРЭМІІ ЗА ЛЕПШАЕ РАСПАЎСЮДЖВАННЕ ПАЗЫКІ

За паспяховую арганізацыю работы па рэалізацыі пазыкі Трэцяй пяцігодкі (выпуск трэцяга года) Нарком фінансаў БССР прэміраваў 173 чалавекі па суму 35.000 рублёў. Сярод прэміраваных — 67 упаўнаважаных сельсаветаў па пазыцы, 40 старшынь сельскіх камсодаў, 33 фінансавых агенты, 13 загадчыкаў райашчадкас.

Прэміі атрымалі загадчык Скідэльскага райфінаддзела, Беластоцкай вобласці т. Елкін, загадчык райашчадкасы т. Рубанаў, загадчык Быхаўскай райашчадкасы т. Несцярэнка, старшыня камсода Мінскага радыёзавода т. Карасік, упаўнаважаны па пазыцы ў калгасе «Чырвоны агароднік», Мінскага раёна, ордэнаносец тав. Трушкевіч, старшыня Шумянскага селькамсода, Віцебскага раёна, тав. Яскін і інш.

Цэх піяніна

БАРЫСАЎ. (Кар. «Звязды»). Прыемныя меладычныя гукі фортэпіяна разліваюцца па заводскім двары. Тут, на дрэваапрацоўчым заводзе імені Молатава, 4 годы таму назад упершыню быў арганізаван новы цэх піяніна. Тады выпуск іх раўняўся адзінкам. У 1939 і 1940 гг. вытворчасць значна павялічылася. Дзесяткамі і сотнямі накіроўваюцца новыя піяніна — прадукцыя Барысаўскага завода—у гарады Саюза для продажу насельніцтву. Краіна атрымала ўжо 974 піяніна.

Рэгуліроўшчыкі, настройшчыкі, паліроўшчыкі заканчваюць зборку яшчэ 38 штук. У бліжэйшыя дні завод выпусціць тысячнае піяніна.

Па гарадах Совецкай Беларусі. На вы чыгуначны тэхнікум у Брэсце.
Фото В. Лупейка. (Фотахроніка БЕЛ).

УСЕБЕЛАРУСКІ КРОС КАЛГАСНІКАЎ-ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

Сёння ў Мінску праводзіцца ўсебеларускі традыцыйны крос калгаснікаў-фізкультурнікаў, прысвечаны Усесаюзнай скаргаспадарчай выстаўцы. Удзельнічаюць 70 калгаснікаў усходніх абласцей рэспублікі. Сярод іх—майстар спорту калгаснік сельгасарцелі імені Леніна, Падгайскага сельсавета, Мінскага раёна, Надзя Рудзевіч.

У праграме—кіданне гранаты, бег на дыстанцыю ў 5 кілометраў для мужчын, 1 кілометр для жанчын, велакрос на 20 кілометраў для мужчын і на 10 кілометраў для жанчын.

У парадку падрыхтоўкі да ўсебеларускага кроса ў рэспубліцы праходзілі раённыя і раённыя кросы калгаснікаў-фізкультурнікаў. У Несвіжскім раёне (Мінскай вобласць) у кросе прынялі ўдзел больш 400 чалавек.

1 верасня ў Беластоку адбудзецца калгаснікаў-фізкультурнікаў заходніх абласцей БССР. У ім прыме ўдзел 80 чалавек.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Дом партактыва Мінгаркома КП паведамляе, што з 1 верасня аднаўляе работу марксісцка-ленінскі універсітэт штодня, акрамя выхадных дзён.

Рэгістрацыя праводзіцца ў канцылярыі Дома партактыва штодзённа (акрамя выхадных дзён) з 1 гадзіны дня да 9 вечара.

Дом Партактыва Мінгаркома КП(б)Б.

***

26 жніўня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Палаца піонераў для сакратароў комсамольскіх арганізацый, членаў камісій і агітатараў адбудзецца інструктыўны даклад аб XXVI Міжнародным юнацкім дні.

Дакладчык—сакратар ЦК ЛКСМБ Ефройкін.

Сакратар Мінскага гаркома ЛКСМБ ФЕРДЗЯР.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОВ

ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА БССР.

(Памяшканне Дзярж. яўрэйск. тэатра БССР)

25 жніўня

«СОБАКА НА СЕНЕ»

Пачатак у 8 г. 30 м. вечара.

Каса адкрыта з 4 г. дня да 9 г. вечара.

Гарадскія касы з 12 г. дня да 6 г. вечара.

ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА МУЗЫКАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ БССР.

(Памяшканне Белдзяржфільмтэатра)

25 жніўня

«СИЛЬВА» Музкамедыя ў 3 дзеях.

Пачатак у 8 г. 30 м. вечара. Білеты ў касе тэатра з 2 да 8 г. 30 м. вечара і ў гарадскіх касах з 12 г. дня да 6 г. вечара.

ДЗЯРЖЦЫРК

(парк ім. Горкага, тэл. 22-725).

СЁННЯ ВЯЛІКАЯ ЦЫРКАВАЯ ПРАГРАМА

ў 3 аддзяленнях.

Прадаўжэнне матчаў Французскай барацьбы

Боруцца 3 пары:

1. ПАДДУБНЫ—ДЗЯКОЎСКІ
2. ТАЙВОНЕН—ЛЕБЕДЗЕЎ
3. СТРЫЖАК—ДАВІДОВІЧ

Пачатак у 9 гадзін вечара.

Пачатак барацьбы ў 11 г. вечара.

СЁННЯ — ВЯЛІКАЕ ДЗЁННАЕ ПРАДСТАЎЛЕННЕ АДНОЎЛЕНАЯ ПРАГРАМА

Пачатак у 2 г. дня. Каса — з 10 г. раніцы.

Кінатэатр «Чырвоная зорка» ЦАНА ЖЫЦЦЯ

Кінатэатр «Родина» БУДНІ

Кінатэатр «Інтэрнацыянал» ЗНІШЧАЛЬНІКІ

Кінатэатр «Спартак» ТРАКТАРЫСТЫ

Дзіцячы кінатэатр «ТОМ СОЙЕР»

Кінатэатр «Навіны дня»

1. VII Сесія Вярхоўнага Совета СССР. (Выпуск 1).
2. Саюзкінажурналы №№ 73, 74 і 75.

ШКОЛА ФЗВ ДРУКАРОЎ

аб'яўляе ДАДАТКОВЫ ПРЫЁМ вучняў

ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

наборшчыкаў, друкароў і пераплётчыкаў.

У школу прымаюцца асобы абодвух полаў ва ўзросце 15—17 год. Адукацыя 5—7 класаў.

ТЭРМІНЫ НАВУЧАННЯ СКАРОЧАНЫ.

СТЫПЕНДЫЯ ад 70 да 150 рублёў у месяц. ІНТЭРНАТ ПРАДАСТАЎЛЯЕЦЦА.

Для паступлення неабходна прадставіць наступныя дакументы: заяву, аўтабіяграфію, дакумент аб асвеце, метрычную выпіску і дзве фотакарткі (калгаснікі павінны прадставіць даведку ад калгаса аб водпуску на вучобу)

ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА ДА 10 ВЕРАСНЯ.

Адрас: Мінск, вул. Пушкіна, 55, Дом друку, перцы паверх, школа ФЗВ друкароў. Тэлефон 22-359.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Мінская 2-гадовая школа лабарантаў і медсясцёр

НАРКАМАТА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БССР

прадаўжае НАБОР

НА 1 КУРС

СКОНЧЫЎШЫЯ ШКОЛУ АТРЫМЛІВАЮЦЬ СЯРЭДНЮЮ МЕДЫЦЫНСКУЮ АСВЕТУ.

Прынятымі ў лік слухачоў могуць быць асобы абодвух полаў, дасягнуўшыя 16-гадовага ўзросту і скончыўшыя 7 класаў сярэдняй школы.

Для паступлення неабходна прадставіць у канцылярыю школы атэстат аб адукацыі, метрыку або пашпарт, дзве фотакарткі, заяву, аўтабіяграфію, паштовых марак на 60 кап.

ПРЫЁМНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ ПРАВОДЗЯЦЦА па рускай, беларускай мовах, матэматыцы і Канстытуцыі СССР па праграме 7 класаў сярэдняй школы.

Скончыўшыя сямігодку на выдатна прымаюцца без прыёмных экзаменаў.

Прынятыя ў лік слухачоў забяспечваюцца стыпендыяй, згодна пастановы ўрада.

Інтэрнатаў школа не прадастаўляе, прыезджым аплачваюцца кватэрныя грошы ў размерах прадугледжаных пастановай урада.

Слухачы забяспечваюцца ложкамі і пасцельнымі прыладамі.

ДАКУМЕНТЫ ПРЫМАЮЦЦА ДА 30 ЖНІЎНЯ г. г. у канцылярыі школы ад 9 да 5 гадзін дня штодзённа (акрамя выхадных дзён) і поштай.

ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ 1 ВЕРАСНЯ 1940 года.

АДРАС: Мінск, 7-я лінія, № 20 (Лагойскі тракт) 2-гадовай школе лабарантаў і медсясцёр. Тэлефон 25-211.

ДЫРЭКЦЫЯ.

УПРАЎЛЕННЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТУР УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА НА ЛЕПШУЮ П'ЕСУ

ПРАЦЯГНУТ ДА 1 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

ОРГКАМІТЭТ КОНКУРСА НА ЛЕПШУЮ П'ЕСУ ПА БССР.

ДА ЎВАГІ ГРАМАДЗЯН, КАЛГАСНІКАЎ, ПІОНЕРАЎ, ШКОЛЬНІКАЎ!

ЗБІРАЙЦЕ ЛЯКАРСТВЕННЫЯ РАСЛІНЫ

НЕ ЎПУСКАЙЦЕ ЧАСУ ЗБОРУ ІХ І

ЗДАВАЙЦЕ

У АПТЭКІ, АПТЭЧНЫЯ ПУНКТЫ пры ўрачэбных участках, САНЛАРКІ І МАГАЗІНЫ САНГІГІЕНЫ

НАСТУПНЫЯ ЛЯКАРСТВЕННЫЯ РАСЛІНЫ, ЯГАДЫ І ТРАВЫ

(ПА ЎСТАНОЎЛЕНЫХ ЦЭНАХ):

ЧАРНІКУ
СПАРЫННЮ (ражок)
ЛІКАПОДЗІЙ (дзераза)
ПЛАДЫ ШЫПОЎНІКА
МАЛІНУ СУШАНУЮ
БАДЗЯГУ
КАРУ КРУШЫНЫ
ВОСК
ТАЛАКНЯНКУ
ТРЫФОЛЬ

ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО З ГЭТЫХ РАСЛІН ВЫРАБЛЯЮЦЦА НЕАБХОДНЫЯ МЕДЫКАМЕНТЫ, І ЗДАЮЧЫ ІХ У АПТЭКІ, ВЫ ДАПАМОЖАЦЕ ПАВЯЛІЧЫЦЬ КОЛЬКАСЦЬ ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНЫХ ЛЯКАРСТВАЎ ДЛЯ ЛЯЧЭБНЫХ МЭТ.

Усе даведкі можна атрымаць у аптэчных установах і ў Галоўаптэкаўпраўленні — Мінск, вул. Горкага, 1.

ГАЛОЎАПТЭКАЎПРАЎЛЕННЕ БССР.

Рэдакцыі газеты «ЗВЯЗДА» патрэбны КУР'ЕРЫ

ЗВЯРТАЦЦА: Совецкая 49, III паверх, у сакратарыят.

Калектыў тэатра Юнага гледача БССР імені Н. К. Крупскай з глыбокім жалем паведамляе аб дачасным смерці актрысы тэатра Лідзіі Ануфрыеўны АБАКУН, наступаўшай 24 жніўня пасля доўгай хваробы, і выражае спачуванне сямі.

У3373. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., Л., Ш.